№ 32 (630) 26 жніўня 2009

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыдня, у серады



**Палітбюро-2009: Хто ж ён, беларускі Троцкі?** Старонка 8

**Як стаць знакамітым?** Старонка 6

**«Воплі Відаплясава» ўзнялі бел-чырвона-белы сцяг** Старонка 10

## У НУМАРЫ

**Заставацца на сувязі**

Нягледзячы на крызіс, аператары мабільнай сувязі вядуць вайну за новых абанентаў. **Старонка 4.**

**Палітрэкрут Жалезнічэнка едзе вучыцца ў Амстэрдам**

Ён паступіў у тамтэйшы Тэхнічны ўнівэрсітэт. **Старонка 9.**

**Экалагічная і эканамічная — наша страва**

Новы цыкл у рубрыцы НН, прысвечаны сапраўднай беларускай кухні. **Старонка 11.**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

**Сустрэча з палітолагамі Віталем Сіліцкім і Дзянісам Мельянцовым у Віцебску 27 жніўня**

адбудзецца па адрасе: вул. 1-я Сенненская, д. 5 (раён «Лучоса») у «Еўрапейскім клубе». Пачатак — 18.30. Тэл. для даведак: 27-23-39, (029) 711-08-98, 118-92-38.

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі старонку 2.

# Здымайце беларускае

Прадстаўнікі Мінгарвыканкама прымушаюць аператараў вонкавай рэкламы зняць білборды «Беларускае — самае маё». За экзекуцыяй стаіць апарат Наталлі Пяткевіч. **Старонка 2.**




PHOTO.BYMEDIA.NET

# Лукашэнка адпачывае ў Сочы

Дэлегацыя спынілася ў шыкоўным гатэлі Дзерыпаскі.

21 жніўня Аляксандр Лукашэнка паляцеў у Сочы. Перад гэтым у Талочыне ён паведаміў, што пра наступную сустрэчу з Мядзведзевым яны дамовіліся яшчэ ў Чалпон-Аце на саміце АДКБ. «У найбліжэйшы час трэба абазначыць парадак дня, у які павінны быць уключаныя складаныя пытанні, — сказаў Лукашэнка. — Цяпер прэзідэнт Расіі, як вядома, знаходзіцца ў Сочы, і ён запрасіў мяне сустрэцца».

Кіраўнік краіны запэўніў, што з расійскім кіраўніцтвам у яго па-ранейшаму выдатныя стасункі. «У нас добрыя адносіны з Расіяй, выдатныя ў нас з Расіяй адносіны. У нас ёсць праблемы — гэта так. Але хто нічога не робіць, у таго праблемаў няма», — патлумачыў Лукашэнка. Ён таксама выказаўся, што не збіраецца «выпускаць злачынцаў і ламаць заканадаўства», як хочуць на Захадзе.

Гэта заўважна кантраставала з нядаўнімі словамі Лукашэнкі ў бок саюзніцы: «Скажыце, што я мушу абараняць у вас і за што мусяць гінуць мае хлопцы? За тое, што Беларусь у Расіі на рынак не пускаюць? Ці за тое, што энергарэсурсы з Казахстана, Расіі па шалёных цэнах павінен купіць?»

Проста з палёў Талачыншчыны, узброіўшыся некалькімі бутэлькамі парэчкавага віна, накіраваўся ў Сочы.

Афіцыйныя СМІ толькі ў панядзелак паведамілі, што Лукашэнка знаходзіцца з рабочым візітам у сталіцы зімовай Алімпіяды-2014. Памочнік жа Мядзведзева па міжнародных пытаннях Сяргей Прыходзька паведаміў, што беларускі лідэр у адпачынку, які будзе працягвацца да канца жніўня. Гэтая заява мела палітычны падтэкст: маўляў, не верце, ніякі гэта не візіт.

**Лукашэнка:** «Прэзідэнт Расіі запрасіў мяне сустрэцца». **Памочнік Мядзведзева з намёкам:** «Беларускі лідэр — у адпачынку».

Тым не менш, плануецца, што сустрэча двух кіраўнікоў можа адбыцца 27 жніўня.

Для Лукашэнкі адпачынкі ў Сочы сталі традыцыйнымі. На курорт ён прыязджае стабільна двойчы ў год. Заўсёды там жа знаходзяцца ці Пуцін (раней), ці Мядзведзеў цяпер. Прычым, у Сочы Лукашэнка ездзіць і ў летні, і ў зімні сезон.

**Працяг на старонцы 3.**

## КАМЕНТАР

«Родзіна» — адзін з самых шыкоўных гатэляў Расіі. Ноч у ім каштуе ад 800 да 2800 даляраў. Кіраўніка Беларусі звычайна суправаджаюць некалькі дзесяткаў ахоўнікаў, памочнікаў, кухараў, сваякоў і калег. З улікам гэтага можна ацаніць агульны кошт.

У прынцыпе, кіраўнікі многіх дзяржаваў свету лічаць неабходным трымаць высокі ранг адпачынку. Розніца ў празрыстасці выдаткаў. У Беларусі асабістае жыццё кіраўніка дзяржавы застаецца таямніцай, а размеркаванне дзяржаўных выдаткаў вызначаецца не абраным парламентам, як у дэмакратычных краінах, а, фактычна, самой выканаўчай уладай. Роля ж парламента ў Беларусі пераважна дэкаратыўная.

**Барыс Тумар**

# Беларускае — самае маё

**Але не ўсім. За зняццём рэкламы «Беларускае — самае маё» стаіць апарат Наталлі Пяткевіч.**

Прадстаўнікі Мінгарвыканкама прымушаюць аператараў вонкавай рэкламы зняць білборды «Беларускае — самае маё». Прадстаўнікі Асацыяцыі рэкламных арганізацый у неўразуменні, але выконваюць «пажаданне».

Упраўленні ідэалогіі і гандлю Мінскага гарвыканкама стаяць на вушах. З самага верху ім далі па шапцы за білборды «Беларускае — самае маё». Паводле чутак, што ходзяць у чынавенскіх калідорах, загад разабрацца далі непасрэдна з Адміністрацыі прэзідэнта. Там за ідэалогію адказвае Наталля Пяткевіч — намесніца кіраўніка Адміністрацыі.

Рэклама на беларускай мове мела спрыяць продажу беларускіх тавараў, але яе палічылі «занадта нацыяналістычнай». Білборды былі выкананыя на беларускай мове. Уласна, фігуравалі ўсяго чатыры словы: «Беларускае — самае маё» і «Дзякуй» пад штрых-кодам. Плюс стылізаваны арнамент, у якім выкарыстоўвалася васьміканцовая зорка з традыцыйнай вышыўкі. Бела-чырвона-зялёная гама, у якой былі выкананыя білборды, не ўратавала. Занадта гонару пабачылі, імаверна, у фармулёўцы: «Самае маё».

Ідэолагі з гарвыканкама ўжо зубы з'елі на выяўленні ідэалагічных дыверсій. Змест усёй гарадской рэкламы, нават на стэндах у метро, узгадняецца з ідэалагічным аддзелам. У сувязі з гэтым рэкламу незалежных СМІ папросту не дазвалялі. Не прапусцілі нават мізэрную абвестачку «Нашай Нівы» памерам 10 на 10 сантыметраў аб тым, што газета вярнулася ў продаж у шапіках «Белсаюздруку». Афіцыйным адказам у разгар крызісу заўжды было крывадушнае: «Адсутнічаюць свабодныя плошчы».

Так што апошні разнос уразіў нават іх. Упраўленням гандлю, паслуг і ідэалогіі загадана пільнасць падвоіць. У сувязі з гэтым ідэолагі цяпер вывучаюць на «нацыяналістычнасць» змест іншай беларускамоўнай рэкламы.

«Зразумела, што нешта адбываецца, але што — ніхто нічога не ведае», — паведамляе marketing.by.

Фармальна чыноўнікі абвінавацілі рэкламістаў у непрафесіяналізме і беднасці ідэй. Чыя б карова мычала...

Прадстаўнікі Асацыяцыі рэкламных арганізацый сказалі «НН», што «нам не забаранілі, нас папрасілі зняць рэкламу. У Мінску стаяла каля 60 выяваў. Учора і сёння іх ужо актыўна здымаюць. Болей ніякай інфармацыі мы даць не можам, бо самі яе не маем. Усе пытанні да Міністэрства гандлю».

Як раней расказаў «НН» Ігар Самкін, дырэктар Асацыяцыі рэкламных арганізацый Беларусі, ідэя рэкламы «Беларускае самае маё» нарадзілася падчас размовы з прадстаўнікамі Міністэрства гандлю.

Распрацавалі «Беларускае — самае маё» дызайнеры сяброў Асацыяцыі рэкламных арганізацый.

У Мінску стаяла каля 60 білбордаў. Усё гэта зроблена на добраахвотных пачатках. У акцыі ўдзельнічалі чатыры кампаніі: «Коларэкспрэс», «Біг Борд», «Багема» і «Прэспектпрэс».

...«О, як далёка нам яшчэ да Беларусі», — так пісаў класік. «Не сваё — не шкода», — а так кажуць у народзе.

**Мікола Бугай; НШ**

VOX POPULI

## А вам спадабалася рэклама «Беларускае — самае маё»?

Не паспелі людзі прызвычаіцца да выразу «Беларускае — самае маё», як яго ўжо знялі з білбордаў. Карэспандэнты пацікавіліся, ці застаўся нейкі успамін у звычайных жыхароў горада пра гэтую сацыяльную рэкламу.

**«НН»: Скажыце, вы бачылі рэкламу «Беларускае — самае маё» і ці спадабалася яна вам?**

**Мужчына сталых гадоў:** Сэнс рэкламы харошы — сваё, беларускае. А па змястоўнасці малюнкаў, графікі ці кампутарнай апрацоўцы — не ведаю. Але сэнс харошы. Да ўсяго беларускага патрэбна рэклама.

**Хлопец з дзяўчынай:** Так, бачылі. Мне яна падабалася, бо ўвогуле рэдка можна ўбачыць у горадзе надпіс, які будзе напісаны па-беларуску, ці штосьці пра Беларусь, пра нацыянальнае. Наколькі я ведаю па інфармацыі са СМІ, гэтую рэкламу хочуць прыбраць чыноўнікі, і гэта мяне не задаволіла. Сама рэклама зроблена класна. Але, калі ў нашых чыноўнікаў няма фантазіі, то ім гэта не падабаецца. Яны супраць мовы, супраць нашай культуры.

**Мужчына з дачкой на руках:** Бачыў. Няма мне розніцы ці ёсць яна, ці няма. Мне ўсё роўна.

**Жанчына:** Так, у горадзе шмат стэндаў. На мой погляд, яна магла б быць ярчэйшай. Трошкі праставата выглядае, але ў гэтым штосьці ёсць.

**Маладая дзяўчына:** Дзесьці бачыла. Хацелася б, каб вока радавалася, калі на рэкламу глядзіш. Гэтая нейкая бледнаватая была.

**Хлопец:** Мы бачылі іншую: «Купляйце беларускае».

**Хлопец з сяброўкамі:** Я бачыў. Мне спадабалася. Нагадвае пра радзіму. Людзі пра радзіму забываюцца і трэба падтрымліваць рэкламай. Вось я заўсёды памятаю пра ДАІшнікаў і пра рэкламу «Беларускае — самае маё».

**Хлопец з дзяўчынай:** Не, не бачылі. Не патрэбна нам такая.

**Жанчына з дзіцём:** Не. Мы — госці сталіцы.

Адказаў «не бачылі» і «не памятаю» было больш за ўсё. Не паспелі людзі заўважыць «Беларускае — самае маё», як рэкламу ўжо прыбралі. Аднак тыя, хто бачыў, пагаджаюцца, што было штосьці ў ёй адрознае ад іншай беларускай сацыяльнай рэкламы.

**Настасся Шамрэй**

СЦІСЛА

### У Google Translate дадалася беларуская мова

Прыемная навіна для карыстальнікаў інтэрнэту. У онлайн перакладчыку сэрвісу Google нарэшце з'явілася беларуская мова. Зараз можна перакладаць тэксты з 50 моваў свету на беларускую і наадварот.

### Выпадкі свінога грыпу

У Беларусі пацверджаныя яшчэ два выпадкі заражэння свіным грыпам. Захварэлі дзеці, што вярнуліся зададраўлення з Вялікабрытаніі. Цяпер яны ў бальніцы.

### У аэрапорт праляжа чыгунка

У самім жа аэрапорце «Мінск» пабудуюць гатэль. Гэтыя пытанні абмяркоўваліся на штабе па рэканструкцыі аэравакзала. У ім узяў удзел міністр транспарту і камунікацый Іван Шчэрба. У сярэднім штодзень аэрапорт абслугоўвае 2300 пасажыраў.

### Узрастуць цэны на праезд

Уласнымі даходамі ў першым паўгоддзі 2009 года акупляецца 72,9% перавозак. Таму Мінтранс хоча падвысіць тарыфы.

### Фінберг ініцыюе конкурс беларускай песні

«Я напісаў ліст новаму міністру культуры [Паўлу Латушку] пра арганізацыю нацыянальнага конкурсу выканаўцаў беларускай песні, — сказаў маэстра. — Людзі павінны праз яго выходзіць на «Славянскі базар» ці «Новую волну», — марыць Фінберг.

**МБ; ВЖ; БЕЛТА**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытачоў газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй

## за ахвяраванні

Валерыю П., Алесю Б. з Баранавіцкага раёна.
Аляксандру Л. з Гомеля.
Сьвятлане К. з Ліды.
Алене Г. з Барысаўскага раёна.
Валянціне Ш., Л.Г., З.А., А.Л., Сямёну Л., Вользе Ш., Ніне Ш., Ігару Б., Дз. Я., В.Б., П.Ч., Р.П., Д.К., В.Л., Алегу М., Г.С., Аляксандру С., Івану С., А.Дз., Валянціне Дз., В.Л., Генадзю Ш., Георгію П., С.Ц., І.Б., І.С., Таццяне В., Алегу Т., Тамары Л., Галіне Ж., Соф'і Я., Міхаілу З., Іраідзе З., Л.Л., Вользе П., В.Я.П., В.М.П., Д.К., Юрыю Л., Леаніду Г., А.Р., Рыце Н., Наталлі М., А.А., Генадзю К., А.К., Н.Б., С., А.С., В.Ц. з Мінска.
Алесю Н. са Слуцкага раёна.
Уладзіміру Л. з Маладзечна.
Валянціне А., Святаславу Г. з Талачынскага раёна.
Уладзіміру Я., Юліі І. з Барысава.
Антону Т. з Жодзіна.
А.А. з Полацка.
Сяргею Т. з Лідскага раёна.
Андрэю К. з Глыбоцкага раёна.
Адзе Р. з Шаркаўшчынскага раёна.
Андрэю Б. са Шчучына.
Мікалаю Ш. з Салігорска.

# Бэлу чао

**«Мы адпрацавалі дванаццаць месяцаў. Кантракт доўжыўся ад жніўня летась, і яго тэрмін скончыўся», — заявіў лорд Цімаці Бэл у інтэрв'ю брусельскаму выданню EUobserver.**



Кіраўнік брытанскага піяр-агенцтва Bell Pottinger Group адмовіўся даваць больш шырокую інфармацыю. Паводле выдання, надалей Лукашэнка збіраецца сам займацца сваім іміджам, без парадаў з боку заходніх экспертаў.

У адным з мінулых інтэрв'ю лорд Бэл станоўча ацэньваў вынікі сваёй працы ў Беларусі. «Вельмі гасцінны народ, вельмі прыемна было з імі працаваць», — зазначае англічанін.

У свае заслугі Бэл паставіў тое, што цягам года Лукашэнка даў інтэрв'ю такім уплывовым выданням як Financial Times і Frankfurter Allgemeine Zeitung. Можна ўспомніць, што менавіта Бэл спрагназаваў вызваленне палітвязняў у жніўні 2008 года. Лорд таксама ўхваліў з'яўленне на афіцыйных фотаздымках Лукашэнкі разам з малодшым сынам Колем, але зазначыў, што гэта была не ягоная ідэя.

За апошні год назіралася істотнае пацяпленне ў беларуска-еўрапейскіх адносінах. У кастрычніку 2008 года былі адмененыя візавыя санкцыі супраць Лукашэнкі і шэрагу чыноўнікаў. Кіраўнік Беларусі наведаў Рым і Ватыкан, а таксама быў запрошаны на пражскі саміт «Усходняга партнёрства».

Сярод няўдач Бэла можна назваць правядзенне парламенцкіх выбараў, якія не былі прызнанымі ні свабоднымі, ні дэмакратычнымі. Зрэшты, гэта не замінае Беларусі паступова ўцягвацца ў еўрапейскія працэсы.

Бэл вядомы ў Вялікабрытаніі па працы на былога прэм'ер-міністра краіны Маргарэт Тэтчэр у 1980-я гады. Кліентамі піяршчыка былі экс-прэм'ер Тайланда Таксін Чынаўат, манархі Саудаўскай Аравіі. Цяпер Бэл кансультуе вядомага расійскага алігарха, сябра Лукашэнкі Барыса Беразоўскага, які жыве ў Лондане.

**ЗП**




## Асаблівае меркаванне Васілевіча

**Генеральны пракурор Рыгор Васілевіч лічыць немэтазгодным стварэнне асобнага следчага камітэта, якое ініцыяваў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы таксама мае намер надзяліць КДБ і МУС правам даваць ордэры на арышт і ператрусы. На думку праваабаронцаў, гэта выведзе дзейнасць сілавікоў з-пад кантролю пракуратуры.**

# Лукашэнка адпачывае ў Сочы

Працяг са старонкі 1.

У жніўні 2006-га самым важным было абмеркаванне ў Сочы газавага пытання, таксама ў той час мусіраваліся чуткі пра магчымы рэферэндум па канстытуцыйным акце саюзнай дзяржавы. У сакавіку 2007 года Лукашэнка адпачываў у Краснай Паляне разам са сваімі сынамі, спявачкамі і спартоўцамі.

У жніўні 2007 года на павестцы дня стаялі зноўку ж перамовы па газе і нафце, а таксама па крэдыце. Гэта ж самае Пуцін і Лукашэнка абмеркавалі ў лютым 2008 года.

Мінулым летам у Сочы Лукашэнка быў вымушаны захапляцца «мудрай і прыгожай» вайсковай аперацыяй Расіі у Паўднёвай Асеціі. Тады ж яму наладзілі вочную стаўку з Какойты і Багапшам. Тады ж Лукашэнка ўпершыню пасяліўся ў гатэлі «Радзіма», які належыць расійскаму алігарху Алегу Дзерыпаску. «Камсамолка» паведамляе, што цяпер ён спыніўся там жа.



У сакавіку сёлета Лукашэнка прыбыў у Сочы ўжо пасля двух аналагічных «неабвешчаных адпачынкаў» у Сербіі і Арменіі. Гаварылі пра магчымы ўдзел Беларусі ва «Усходнім партнёрстве». Цяпер вось новы адпачынак.

**Зміцер Панкавец**

## Шміт датэрмінова пакідае пасаду

8 верасня ў мінскім офісе АБСЕ будзе прадстаўлены новы намеснік кіраўніка прадстаўніцтва. Ім стаў казахскі дыпламат Жандос Асанаў. Да гэтага Асанаў з'яўляўся дарадцам-пасланнікам прадстаўніцтва Казахстана пры АБСЕ.

Чакаюць у Мінску і прызначэння наступніка Ганса-Ёхана Шміта, які датэрмінова пакідае пасаду кіраўніка офіса.

«Прызначэнне павінна адбыцца ўжо восенню», — паведамілі «НН» у прэсслужбе мінскага офіса АБСЕ. У аўторак артыкул у падтрымку Шміта змясціла газета Адміністрацыі прэзідэнта «Советская Белоруссия».

**ЗП**

## Сцісла

### Ушацкас прыязджаў у Беларусь прыватна

24—25 чэрвеня ў Беларусі з прыватным візітам знаходзіўся міністр замежных справаў Літвы Вігаўдас Ушацкас. Наведаць Беларусь і разам агледзець месцы гістарычнай спадчыны часоў Вялікага княства Літоўскага ў Лідзе, Навагрудку, Нясвіжы і Міры Ушацкаса запрасіў ягоны беларускі калега Сяргей Мартынаў.

### Нацыянальны сцяг над Гомелем

25 жніўня, на гадавіну зацвярджэння Дэкларацыі аб незалежнасці Беларусі, прыблізна а 7-й раніцы ў Гомелі маладафронтаўцы вывесілі бел-чырвона-белы сцяг. Ён лунаў у раёне ўнівермага «Гомель», на дроце паміж пяціпавярхоўкамі па вул. Савецкай.

### Дубскага не вызвалілі

Судовая калегія Магілёўскага абласнога суда адмовілася задаволіць касацыйную скаргу Арцёма Дубскага на прысуд і змяніць яму меру пакарання. Цяпер хлопца накіруюць у калонію. Ён пакараны годам турмы за парушэнне ўмоваў адбыцця «хіміі» па «справе чатырнаццаці».

**ЗП; СТ**

# «Новае жыццё» не здае храму

**Пратэстанцкая грамада «Новае жыццё» яшчэ 19 жніўня павінна была пакінуць будынак храма, што знаходзіцца ў Сухарава ў былым кароўніку.**

У 2002 годзе грамада набыла гэты будынак для далейшага пераабсталявання яго ў царкву. На працягу двух наступных гадоў пратэстанты двойчы атрымлівалі дазвол у Мінгарвыканкаме на будаўніцтва.

Урэшце, ужо ў 2005 годзе сталічныя ўлады вырашылі выкупіць у «Новага жыцця» будынак па прычыне «нямэтавага выкарыстання». Здавацца проста так вернікі не збіраліся.

Восенню 2006 года пратэстанты наладзілі галадоўку-пост, у якой узялі ўдзел больш за 200 чалавек, і доўжылася яна 23 дні. Пасля таго як пастар Вячаслаў Ганчарэнка наведаў Адміністрацыю прэзідэнта, галадоўку спынілі. Аднак судовыя цяжбы працягнуліся.

Цяпер судовы выканаўца прынёс пастанову аб тым, што калі грамада не пакіне храм, то супраць іх можа быць ужытая фізічная сіла. 20-21 жніўня ў царкве прайшоў 26-гадзінны музычны марафон, калі калектывы з іншых пратэстанцкіх суполак выконвалі на сцэне свае песні.

Штурму пакуль не адбылося. Гарадскія ўлады прапаноўваюць кампенсацыю за будынак — 11 тысяч даляраў (мізэрны кошт як для сталічнай нерухомасці), але вернікі не згаджаюцца. «Гэта наш будынак. Мы яго не скралі. Уклалі сюды грошы, сэрца і душу. Мы тут умацоўваемся верай», — кажа пастар Вячаслаў Ганчарэнка.

25 чэрвеня Ганчарэнку, а таксама юрыста царквы Сяргея Луканіна прынялі паслы краін Еўрасаюза. Сюжэты пра «Новае жыццё» пастаянна з'яўляюцца на дзяржаўных тэлеканалах.

**Зміцер Панкавец**



Пратэстанты выбудавалі сваю царкву з кароўніка.

**Хрысціяне поўнага Евангелля**

— імі з'яўляюцца прыхаджане «Новага жыцця». Яшчэ іх называюць неапяцідзесятнікамі і харызматамі. Гэты рух узнік у ЗША ў 1901 годзе. Харызматы не маюць аб'яднанай дэнамінацыі і агульнага веравучэння, яно дзеліцца на некалькі накірункаў, якія маюць рознасці ў багаслоўі. Асаблівы ўпор яны робяць на праявах дзеяння Бога ў кожным чалавеку. Беларуская Вікіпедыя называе ХПЕ сектантамі. У краіне зарэгістравана 60 прыходаў харызматаў.

# У Мінску набралася шаснаццаць беларускамоўных класаў

Найбольшую колькасць першых класаў набралі Гімназія №4 у Кунцаўшчыне і Гімназія №14 на вуліцы Васняцова — па чатыры. Па два класы набралі Гімназія №9 (Сядых, 10), Гімназія №23 (пр.Незалежнасці, 45). А ў гімназіі №28, што на праспекце Ракасоўскага, другі клас яшчэ камплектуецца. Па інфармацыю звяртайцеся па тэлефонах: 248-32-02, 248-12-64.

Па адным першым класе з беларускай мовай навучання набралі школа з музычнай накіраванасцю №60 на Лібкнехта, 82 і школа №190 на Нікіфарава, 19. У апошняй набор працягваецца да 28 жніўня, даведкі па тэлефоне: 260-24-90.

«Мы рады, што ў нас набраўся такі добры клас», — расказалі ў школе №190.

**Сямён Печанко**

# Заставацца на сувязі

**Нягледзячы на крызіс, аператары мабільнай сувязі вядуць вайну за новых абанентаў.**

### Расія, Аўстрыя і Турцыя — хто каго?

Колькасць абанентаў мабільнай сувязі ў Беларусі склала 9 мільёнаў чалавек. Гэта пакуль што не перавышае агульнай колькасці насельніцтва. Пранікненне мабільнай сувязі ў краіне складае 93%. Мабільнікі працуюць нават там, куды яшчэ не дайшлі стацыянарныя тэлефоны.

Тры гульцы на рынку мабільнай сувязі рэпрэзентуюць тры розныя краіны. Гэта МТС (Расія), Velcom (Аўстрыя) і Life:)(Турцыя). Пасля таго, як дзяржава прадала свае акцыі замежным кампаніям, на рынку значна ўзрасла канкурэнцыя. Цэны не абваліліся, але колькасць цікавых прапановаў і тарыфаў значна ўзрасла. Вайна за спажыўца на руку самому спажыўцу.

### 25000 рублёў з абанента

Паспяховасць аператара мабільнай сувязі можна ацэньваць па некалькіх паказальніках.

Па-першае, гэта колькасць абанентаў. МТС утрымлівае лідэрства з 4,483 мільёнамі абанентаў. Да Velcom падключана 3,817 мільёна чалавек. Life:), нягледзячы на самыя хуткія тэмпы росту, далёка-далёка ззаду — 0,6 мільёнаў карыстальнікаў.

Іншае пытанне, якая доля з гэтых абанентаў актыўная. Няма ніякай праблемы раздаць бясплатна сім-карты ўсёй Беларусі — у абаненты будзе запісана 10 мільёнаў чалавек, а прыбытак застанецца ранейшым, бо шмат хто не будзе карыстацца сувяззю.

Таму другі істотны паказальнік фіксуе колькасць грошай, патрачаных сярэднестатычным абанентам кампаніі. Абанент Velcom у сярэднім па-ранейшаму генеруе больш абароту за кліента МТС. $8,7 за месяц супраць $7,8. Life:) зноў у іншай вагавай катэгорыі. З кожнага карыстальніка туркам ўдаецца атрымаць усяго $1,5.

Калі ж разглядаць уласна прыбытак кампаній за першае паўгоддзе 2009 года, то высвятляецца, што лідэрам стаў Velcom — $39 мільёнаў. МТС зарабіў $35 мільёнаў, а Life:) напрацаваў у мінус $11 мільёнаў.

### Хуткая дапамога Velcom

Аператары не шкадуюць грошай на рэкламу. Па падліках кампаніі «Медыятактыка», тройку самых актыўных рэкламадаўцаў Беларусі складаюць менавіта аператары мабільнай сувязі. Разам яны займаюць каля 18% рэкламнага рынку краіны. Вось што значыць канкурэнцыя!

Але калі лайфаўскі містэр Падключальнік і мтс-аўскі крыкун ў тэатры пастаянна кружацца ў тэлевізары, то рэкламы Velcom доўга не было відаць. Аўстрыйская кампанія часова не супрацоўнічала з каналамі, якія адносяцца да Белтэлерадыёкампаніі, праз асабісты канфлікт з Аляксандрам Зімоўскім. Таму перастаў падабацца ўзровень паслуг аператара. Бакі паразумеліся, але, як кажуць, асадак застаўся. Тым не менш, Velcom не адчувае сябе абдзеленым. Сярод яго карпаратыўных кліентаў, напрыклад, хуткая дапамога.

**Колькасць цікавых прапаноў і тарыфаў значна ўзрасла.**

### Параўнанне з суседзямі

Замежныя мабільныя аператары адаптуюць свае тарыфы да беларускага рынку. Ці адрозніваюцца яны ад тых, што ёсць у суседніх краінах?

Life:) працуе ў Турцыі, Беларусі і Украіне. Асноўны тарыфны план — «Свабодны». Званкі ўнутры сеткі бясплатныя, званкі ў іншыя сеткі ў Беларусі — 249 рублёў, ва Украіне (у пераліку на рублі) — 330 рублёў. Перадаплата ў нас — 10000 рублёў, ва Украіне — 8500 рублёў. Як бачна, прапановы прыблізна роўныя.

А вось МТС у Беларусі, Расіі і Украіне прапануе розныя тарыфы. Напрыклад, кантрактны тарыф «Будзь больш практычным» з абаненцкай платай у 6000 рублёў і званкамі ўнутры сеткі па 60 рублёў. У чымсьці ён перакліканецца з украінскім «МТС першы» з платай у 5000 рублёў у месяц. Але там прапануюцца званкі па 33 рублі за першую хвіліну размовы і 11 рублёў за наступныя. Украінскі варыянт выгаднейшы. А вось расійскі МТС ад абаненцкай платы амаль адмовіўся. Яна захавана толькі на элітных безлімітных тарыфах. Можна меркаваць, што тэндэнцыя адмовы ад абаненцкай платы пяройдзе і на беларускую філію.

Velcom у суседніх краінах не працуе, таму параўноўваць яго тарыфы няма з чым.

Цэны тарыфных планаў на мабільную сувязь у Еўропе выглядаюць значна вышэйшымі, чым у Беларусі. Праўда, за кошт пастаянных акцый і зніжак там без праблем адшукаць бясплатныя варыянты.

**Ягор Марціновіч**

# На два франты. Ці нават на тры



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Дзве сім-карты ў аднаго чалавека — даўно ўжо не раскоша, а патрэба часу.**

Людзі зразумелі, што быць падключаным адначасова да некалькіх аператараў — надзвычай выгадная рэч. Праўда, першае пытанне, якое абавязкова ўзнікне ў абанентаў, якія вырашылі размаўляць на два франты, як гэтыя самыя дзве сім-карткі выкарыстоўваць адначасова. Рашэнняў некалькі, але ўніверсальнага няма.

### Курсы юных самаробкіных

Можна выкарыстоўваць спецыяльныя адаптэры. Гэта прыстасаванне, якое на выгляд нагадвае звычайную сім-карту, але з двума раз'ёмамі.

— Бераце дзве сімкі ад розных аператараў, выразаеце іх сярэднія часткі, устаўляеце ў наш адаптэр і ўсё! Працаваць будзе толькі адзін аператар, але па кнопачцы ў меню можна будзе пераключыцца на другога,— расказваюць сутнасць працы ў інтэрнэт-краме.— Калі передумаеце працаваць з адаптэрам, сім-карты можна будзе ўзнавіць, праўда, выглядаць яны будуць не вельмі прэзентабельна.

Цана на такую прыладу складае каля $7. Сярод магчымых праблем — вельмі хутка сядае акумулятар, бо тэлефону прыходзіцца пастаянна шукаць сетку.

### Кланаваныя карткі

Наступнае — мультысім-карта. Пры выкарыстанні гэтага сродку нажніцы можна адкласці ўбок. Замест іх патрэбны сканер. На спецыяльную сім-карту запісваецца інфармацыя з дзесятка астатніх. Прынцып той самы, што і ў адаптэра — працуе адзін аператар, але можна пераключацца на іншага, не перастаўляючы сім-карты ўнутры апарата. Кошт — $10.

— Можна зрабіць некалькі копій з адной сім-карты. Гэта вельмі зручна для арганізацый, — тлумачаць прадавец Яўген са «Ждановіч». — Каб не ляжала адна слухаўка на ўсіх у сярэдзіне офіса, можна кожнаму супрацоўніку засунуць у мабільнік мультыкартку. У выніку кожны зможа патэлефанаваць з агульнага нумара кампаніі.

Праблема — далёка не ўсе сім-карткі могуць быць адсканаваныя. Напрыклад, у Velcom з новых «сімак» зрабіць копію немагчыма.

### Новы тэлефон

Тэлефоны з дзвюма сім-карткамі — самы просты, але і самы дарагі варыянт. Галоўная перавага гэтага варыянта ў тым, што абодва апараты будуць працаваць адначасова.

Самсунгі ў мінскіх інтэрнэт-крамах каштуюць ад $140, Fly — ад $150. Кітайскіх тэлефонаў шмат. Цэны на іх пачынаюцца ў раёне $100-110. Праўда, могуць узнікнуць праблемы з гарантыяй. Спецыялізаваных майстэрняў па іх рамонце ў Беларусі няма.

### Не замест, а разам

Апошні варыянт — першы, які прыходзіць у галаву. Дастаткова проста купіць другі тэлефон і ўставіць у яго другую сім-карту. На рынку б/у-мабільнікаў каляровы тэлефон са слабенькай фотакамерай можна прыдбаць і за 50 тысяч беларускіх рублёў. Нязручнасць хіба што ў тым, што прыйдзецца насіць з сабой абодва апараты.

Еўропа ўжо прыйшла да асэнсавання, што мець дзве сім-карты — гэта ашчаджаць. Напрыклад, у Італіі на 100 чалавек зарэгістравана больш за 150 падключэнняў. Калі лавіраваць у плыні акцый ад розных аператараў, заўсёды можна падшукваць для сябе эканомныя варыянты.




**ЯМ**

## СЦІСЛА

### Лекам праз інтэрнэт — не

Апроч лекаў, забаранілі таксама продаж праз сеціва ювелірных вырабаў, піратэхнікі, зброі і патронаў да яе. Харчовыя тавары і кулінарыю цяпер можна прадаваць у сеціве толькі пры наяўнасці гандлёвага аб'екта, дзе рэалізуюцца такія тавары.

### Завядуць крэдытныя гісторыі

Цяпер на крэдытабёрцаў будзе стварацца своеасаблівае дасье. Яно будзе фармавацца на падставе звестак, якія даюць банкі. Гэтыя звесткі можа запытаць любая юрыдычная і фізічная асоба, замежная арганізацыя. Яны могуць распаўсюджвацца толькі са згоды суб'екта крэдытнай гісторыі.

### Ровары пад пагрозай

Тысяча супрацоўнікаў Мінскага мотавелазавода выйшла ў неаплачаныя адпачынкі. За пазыкі ў некалькі мільярдаў рублёў заводу адключылі электрычнасць. За жнівень з канвеера сышлі толькі 2000 ровараў.

### Гарбата толькі для багатых

Цэны на гарбату павысіліся да рэкорднага ўзроўню праз засуху ў краінах, якія з'яўляюцца найбуйнейшымі экспарцёрамі напою. Кілаграм гарбаты катэгорыі BP1 каштуе $3,7. Яшчэ ў пачатку года было на чвэрць менш.

### Осла — найдаражэйшы горад

У пачэсным спісе швейцарскага банка UBS пасля сталіцы Нарвегіі ідуць Цюрых, Капенгаген, Жэнева і Токіа. Пацярпелі ад крызісу і, адпаведна, апусціліся ў рэйтынгу Лондан, Масква, Сеул і Мехіка. А вось самымі недарагімі для жыцця названыя азіяцкія гарады Куала-Лумпур, Маніла, Дэлі і Мумбай.

**ЯМ**

# Лукашэнка нацэліўся на чацвёрты тэрмін

Ці пракаўтне Захад чарговую «элегантную перамогу»? Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

Выбары пры канцы 2010 або на пачатку 2011 года будуць сур'ёзным выпрабаваннем у адносінах Мінска з Захадам. Стоячы перад аб'ектывамі на фоне палеткаў Талачынскага раёна, беларускі афіцыйны лідэр папярэдзіў еўрапейцаў: дарма яны наважыліся накідаць нейкія ўмовы «ў разліку на тое — а вось Лукашэнку



няма куды падзецца, як некалі Расія думала...». Увогуле, «калі нехта на Захадзе мяркуе, што вось у нас з Расіяй сапсаваліся адносіны, і мы тут Лукашэнку падкруцім, і ён усіх злачынцаў з турмаў павыпускае, і ён заканадаўства заўтра зломіць, яны памыляюцца».

Па сутнасці, так была агучана заяўка на чацвёрты прэзідэнцкі тэрмін. «Мяне часта пачынаюць крытыкаваць, што, маўляў, Лукашэнка трымаецца за ўладу. Але я надзелены адпаведным правам. Калі нехта на Захадзе разлічвае, што шляхам нейкіх махінацый гэтую ўладу можна забраць і перадаць апазіцыі — нічога з гэтага не выйдзе».

Сэнс гэтага паслання ў тым, што рэжым не збіраецца мяняцца, а правадыр па-ранейшаму моцны і цвёрда трымае стырно.

Як у старым анекдоце пра Рабіновіча: «Не дачакаецеся!»

Фактычна Захаду прапануецца ўгода: мы тут будзем мякка трымаць на дыстанцыі Расію, а вы не лезьце ў нашы выбарчыя справы. Маецца на ўвазе, што наступныя выбары пройдуць паводле звыклага сцэнару.

Паводле прагнозу аналітыка Валера Карбалевіча, «гэтыя выбары могуць стаць цяжкім выпрабаваннем для адносінаў Беларусі і ЕС». Інакш кажучы, апынецца пад ударам паблажлівае стаўленне Брусэля да Мінска. А з ім — і крэдыты Захаду.

Ахілесавай пятой сістэмы Лукашэнкі застаецца эканоміка. Для яе развіцця трэба так ці інакш адкручваць гайкі, а гэта расхіствае аўтакратыю.

# Выбар Наталлі Марар

Піша **Віталь Тарас**.

Журналістка з Малдовы Наталля Марар адмовілася ад расійскага грамадзянства і ад супрацы з расійскімі СМІ. Да гэтага яе падштурхнула нядаўняе рашэнне Канстытуцыйнага суда РФ забараніць журналістцы ўязджаць у Расію «ў мэтах забеспячэння абароназдольнасці альбо бяспекі дзяржавы».

### Няўзброеная і вельмі небяспечная

Пра гісторыю Марар, якая да апошняга часу працавала карэспандэнткай расійскага часопіса «New Times», пісалі шмат. Нагадаю сутнасць у двух словах: малдоўскую журналістку, якая выйшла замуж за журналіста таго ж выдання, грамадзяніна Расіі Аляксея Барабанава, не пускаюць у Расію. Магчыма, улады Расіі ўбачылі падрыў дзяржаўнай бяспекі ў артыкулах журналісткі на тэмы карупцыі сярод высокага чынавенства? Усе спробы абскардзіць дзеянні



спецслужбаў вынікаў не далі.

Марар напісала: «Я больш не хачу грамадзянства краіны, якая паступіла са мной так, як Расія».

Рэдакцыя «New Times» з разуменнем паставілася да яе рашэння. «Яна хоча жыць у Малдове. Гэта яе, Наталлі, дом», — гаворыцца ў рэдакцыйным артыкуле.

Расія ж, на думку рэдакцыі, замест таго, каб стаць для журналісткі яшчэ адным домам, яе выштурхнула.

### У Маскву, у Маскву!

Гадоў пятнаццаць таму многія беларускія журналісты працавалі адразу на некалькі выданняў, у тым ліку і на замежныя СМІ — пераважна расійскія. У расійскіх медыяў тады было значна больш магчымасцяў, чым у беларускіх. Многія паехалі ў Маскву і там засталіся.

З 1993 па 1999 гады і мне давялося працаваць уласным карэспандэнтам «Общей газеты» ў Беларусі. Адна з перавагаў працы ўласнага карэспандэнта палягае на тым, што начальства далёка, стасавацца з ім даводзіцца, як правіла, праз тэлефон. У тыя гады кіраваў карэспандэнцкай сеткай «ОГ» у краінах СНД нехта Кісялёў (журналістаў з такім прозвішчам шмат). Кісялёў ініцыятыву журналістаў не абмяжоўваў і да мяне асабіста прэтэнзій не выказваў. Але аднойчы зрабіў заўвагу: «Я разумею, што вам у вашых матэрыялах імя кожнага беларускага палітыка дарагое, але ў нас гэтых імёнаў ніхто не ведае, і яны нікога тут не цікавяць».

«Общей газеты», прынамсі, у ранейшым выглядзе няма. Як склаўся лёс майго былога начальніка, не ведаю. Але размову тую часам успамінаю.

Для большасці маскоўскіх СМІ, як і раней, усе астатнія сталіцы — Кіеў, Тбілісі альбо Мінск — глухая правінцыя. Як у тым вершыку: «Как известно, от Кремля начинается земля».

### Журналістыка са Знакам пашаны

У гэтай самай манеры, між іншым, дзейнічалі і журналісты НТВ Малкаў з Бабенкам, калі прыехалі ў Мінск па інтэрв'ю са сваякамі зніклых за часы кіравання Лукашэнкі беларускіх палітыкаў і бізнэсоўцаў. Малкава, дарэчы, за заслугі перад айчынай сам Пуцін узнагародзіў Знакам пашаны.

З карэспандэнтамі НТВ спецслужбы ў Мінску паступілі, безумоўна, па-свінску: вывезлі ў лес, забралі відэакасеты, завезлі ў Оршу, дзе пасадзілі ў цягнік на Маскву. А рабіць сюжэт пра зніклых палітыкаў для перадачы на крымінальныя тэмы, разлічанай на самы нізкі густ, альбо паводле прымітыўнага палітзаказу — хіба па-людску?

Падобныя прэтэнзіі можна сёння адрасаваць не толькі да НТВ, але да ўсіх федэральных расійскіх каналаў. Калі раней з'яўленне на іх сюжэтаў з Беларусі выклікала цікавасць, дык сёння ўзнікае толькі адно пытанне: чый палітычны заказ «чыста канкрэтна» выконваюць іх аўтары? Адкуль загад — ад каманды Пуціна ці ад памочнікаў Мядзведзева?

Большасць расійскіх СМІ ператварылася ў сродак масавай прапаганды. А Масква даўно ўжо ўспрымаецца нармальнымі людзьмі не як цэнтр сусвету, а як глыбокая правінцыя — правінцыя духу. Нездарма многія здольныя расійскія журналісты апошнім часам едуць працаваць ва Украіну. Не тое, каб там больш плацілі, але журналісты ў гэтай краіне па-ранейшаму адчуваюць запатрабаванасць сваёй прафесіі, яны ўвесь час на пярэднім краі жыцця, а не плятуцца ў прапагандысцкім абозе.

Некалі, паўтаруся, для беларускіх журналістаў працаваць на вольную расійскую прэсу было гонарам. Але сёння ў Расіі застаюцца, мабыць, усяго некалькі выданняў — «Новая газета», часопіс «Нью-Таймс» ды яшчэ радыёстанцыя «Эхо Москвы», якія імкнуцца гаварыць пра суседнія краіны аб'ектыўна, без імперскага надрыву ці напышлівага цынізму.

Наталля Марар выбрала не проста «свой дом», яна выбрала свабоду. Гэтая свабода патрэбна не толькі Марар, але і ёй краіне. Патрэбна такая свабода і нам у Беларусі — каб нарэшце адчуць сваю краіну сваім домам.

# Рэвізоры з тэлевізара

Журналісты БТ і АНТ — як яны дасталі. Піша **Руслан Равяка**.

Крызіс даецца ў знакі нашай эканоміцы. Гэта можна зразумець, калі пабачыш цяперашнія навіны дзяржаўных каналаў тэлебачання. Чэсныя журналісты сёлета вызначаюцца не толькі агранамічнымі ведамі — паведамляючы пра тоны зжатага, цэнтнеры высушанага і літры здадзенага. Сёлета яны яшчэ, так бы мовіць, і рэвізоры на паўстаўкі.

Штодня нам круцяць сюжэты пра затаваранасць прадпрыемстваў. Маладыя журналісты ездзяць па Беларусі, уломваюцца на заводы і



здымаюць на камеру поўныя паліцы ці застаўлены тэхнікай падворак прадпрыемства.

З разумнымі тварамі яны выкрываюць на ўсю краіну няўдалых мэнэджэраў, распавядаюць пра нялёгкую долю простых працоўных, якія недаатрымоўваюць належны заробак. Маўляў, накрыўкі для закрутак разыходзяцца «на ўра», а вось нажніцы, якія таксама вырабляе прадпрыемства, не прадаюцца на гэтульк і адсоткаў. «Рэвізоры з тэлевізара», як называць іх цяпер на заводах і фабрыках. Пасля такой карцінкі яны пачынаюць разважаць пра хібы кіраўніцтва, закасцянеласць поглядаў. Пачынаеш нават верыць, што вось гэты маладзён з мікрафонам бачыць далёка і перспектыўна, не тое што стары сівы дырэктар. І сам дырэктар апраўдваецца: затое мы выканалі план, даведзены дзяржаваю.

Планы тыя таксама ніхто карэктаваць не збіраецца, таму, з аднаго боку, над кіраўніцтвам вісіць пагроза невыканання ўзятых перад дзяржавай (ці, лепш кажучы, даведзеных) паказчыкаў. А з іншага боку, даводзіцца адказваць і за перавытворчасць нікому не патрэбнай прадукцыі. Не выканаеш плана — знімуць, а то і пасадзяць. Выканаеш, але не прадасі — тое самае.

Журналісты прыедуць, за гадзінку-другую «разбяруцца» ў праблеме і палятуць назад. І няўцям тым маладым і чэсным, што і іх «прадукцыя», якую выліваюць нам на галаву штодня з тэлевізараў, радыё і газет, таксама даўно састарэла маральна. Дый пра перавытворчасць ідэалагічнага прадукту ўжо даўно трэба ўздымаць пытанне. Насельніцтва яму не верыць.

*Баранавічы*

# Як стаць знакамітым

Крэатыўнасць у чалавека ў крыві. Талент або ёсць, або, на жаль, няма. Дзеля справядлівасці варта дадаць, што нават сяму–таму звышталенавітаму пачаткоўцу ёсць чаму павучыцца ў прафесіяналаў. Прадстаўнікі творчых прафесіяў: кінасцэнарысты, акторы, тэлевядоўцы, літаратары і рэкламнікі — падаюць свае дзесяць залатых правілаў, якіх яны трымаюцца і якімі кіруюцца.

### ...паводле кінасцэнарыста Андрэя Курэйчыка

1. Па-першае, сцэнарыст павінен адказаць сабе на галоўнае пытанне: чым драматургія розніцца ад усіх астатніх відаў літаратуры. Толькі ўсвядоміўшы адметную прыроду драматургіі, можна прыступаць да напісання сцэнару або п’есы.

2. Ніколі не спыняцца ў дасканаленні свайго сцэнару. Сцэнар ніколі не бывае дастаткова добры. У кіно ёсць нязменнае правіла: «Кіно нельга зняць лепей за сам сцэнар». А вось горш — лёгка...

3. Сцэнарыст мусіць быць гатовым да супольнае працы. Найперш, з рэжысёрам і прадусарам. Да таго ж, роля сцэнарыста ў камандзе — не лідэра, а інтэлектуальнага цэнтра.

4. Быць цярплівым. Цыкл кінавытворчасці надта доўгі: ад года да пяці. У гэтых умовах сцэнарысту ўвесь час даводзіцца працаваць з тым самым сцэнаром.

5. Дасканала ведаць тэхналогію стварэння кіно. Сцэнар — не толькі твор мастацтва, але тэхзаданне для ўсіх цэхаў: мастакоў, аператараў, асвятляльнікаў, касцюмераў, аддзелу маркетынгу і г.д.

6. Быць назіральным. У адрозненне ад тэатра, кіно не трывае ўмоўнасцяў. У сцэнары ўсё павінна мець повязь з рэальным жыццём.

7. Кіно — жанравае мастацтва. Адно разумеючы прыроду кінажанраў, можна дасягнуць поспеху.

8. Быць гатовым да расчараванняў: адно мінімальны працэнт сцэнароў даходзіць да рэалізацыі. Да таго ж, часцяком даходзіць зусім не ў тым выглядзе, у якім яго напісалі.

9. Вучыцца. Сусветны кінематограф дае невычэрпныя магчымасці да пазнання гэтага мастацтва. Глядзець і аналізаваць кіно — частка прафесіі сцэнарыста.

10. Кожны твой наступны сцэнар мусіць быць лепшы за папярэдні. Адна параза — і цябе больш няма ў гэтай прафесіі.



**Андрэй Курэйчык**

драматург, кінасцэнарыст і актор. Аўтар п’есаў «П’емонцкі звер» і «Понцій Пілат», што былі пастаўленыя ў Тэатры беларускай драматургіі і Купалаўскім тэатры. Сцэнар да камедыі «Любошчы-мілошчы» («Любовь-морковь») з Гошам Куцэнкам і Крысцінай Арбакайтэ прынёс Курэйчыку лаўры аднага з самых пасяховых сцэнарыстаў расійскага кіно за 2008.

### ...паводле музыканта Зміцера Вайцюшкевіча

1. Ніколі не звязвайся з людзьмі няшчырымі, гаўнюкамі, дурнямі... (спіс шырэйшы).



**Зміцер Вайцюшкевіч**

заснавальнік легендарнага фольк-гурту «Крыві». У 2000-х пачаў сольную кар’еру. Чалавек-аркестр, уладальнік аксамітнага вакалу, Зміцер выконвае рок, джаз, шансон, а таксама народныя песні (нават японскія). Піша песні на словы Барадуліна, Дранько-Майсюка, Някляева і Камоцкага.

2. Адчувай вольную прастору для адкрыцця (хай сабе і лакальнага). Першы — найлепшы. Стаў недасягальныя задачы. Складанасць — шлях да ўнутранага дасканалення і поспеху.

3. Бяры больш, чым можаш зрабіць, памыляйся.

4. Умей адпусціць, забыць здзейснены праект.

5. Слухай, аналізуй. Шмат пытайся і прыслухоўвайся да іншых. І... нікога не слухай.

6. Пішы музыку адначасова і проста, і складана.

7. Адпачывай і вучыся адпачываць.

8. Не спяшайся быць папулярным. Вучыся жыць на сцэне доўга. Галоўнае — шукаць сваё.

9. Сышоўшы на год колькі з прафесіі — не вяртайся.

10. Адпрацуй перад Усявышнім свой талент. Неадпрацаванасць таленту — вялікі грэх.

### ...паводле журналіста Віктара Марціновіча

1. Быць журналістам — злачынства. Памятай пра гэта. Падрыхтуйся да таго, што цябе будуць ненавідзець незалежна ад таго, колькім людзям ты дапамог, колькіх выцягнуў з турмы, колькім ты раскрыў вочы на мярзотнікаў, злодзеяў, палахліўцаў. Прызвычайся да думкі, што быць міліцыянерам — пачэсна, быць кантралёрам — прэстыжна, быць журналістам — ганьба. Пастарайся, каб твае дзеці не выгадаваліся журналістамі.

2. Ісціны не існуе (Горгій). Лыжкі не існуе (Нэа). Жанчыны не існуе (Лакан). Замест ісціны ёсць праўдападобная інтэрпрэтацыя. Калі чалавек кажа, што ты схлусіў, гэта азначае, што твая інтэрпрэтацыя не супадае з яго хлуснёй. Калі ў артыкуле ўжытае слова «ісціна», дык гэта — прапаганда.

3. Журналістыка пачынаецца там, дзе завяршаецца прапаганда. Літаратура пачынаецца там, дзе завяршаецца журналістыка. Філасофія пачынаецца там, дзе завяршаецца літаратура. Спіс можна працягваць да бясконцасці. Галоўнае — не займайся прапагандай. Запомні: тыя, за каго ты агітуеш, абыдуцца з табой пасвінску.

4. Будзь суб’ектыўны, паколькі аб’ектыўнасць — сутнасць пераканаўча выкладзенай суб’ектыўнасці. Разбярыся, што добра і што блага для цябе асабіста, і рабі так, каб як мага больш чытачоў з табой пагадзілася.

5. Не давай веры нікому. І яшчэ раз: не давай веры нікому.

6. Навучыся або хутка бегаць, або адпрацуй добры правы хук. Заўсёды бі першым, цэлься ў пераноссе або ніжнюю сківіцу. Ніколі не звані ў міліцыю. Калі іх было некалькі — знайдзі і дай ім рады паасобку.

7. Ніколі не знаёмся асабіста з тымі, пра каго думаеш і пішаш дрэнна: яны ж выявяцца прыязнымі і ўсмешлівымі хлопцамі, што любяць котачак і цямяць у класічнай музыцы. Той факт, што яны пры гэтым робяць нейкае паскудства ці глупства, хутка адсунецца ў вашых



**Віктар Марціновіч**

намеснік галоўнага рэдактара «Белгазеты». Лектар ЕГУ. Публіцыст, пісьменнік, вораг. Галоўнае злачынства перад чалавецтвам заключаецца ў тым, што ён піша. Першы тэкст напісаў у 1995 годзе на першым курсе журфака для «Белорусской деловой газеты», каб было чым плаціць за навучанне. Пасля гэтага за выдатную паспяховасць быў пераведзены на бясплатнае. Стуль ад журналістыкі пазбыцца так і не ўдалося, нягледзячы на абароненую ў Вільні доктарскую і раман, што мае выйсці неўзабаве. Чытаў Хадановіча. Бачыў Акудовіча.

адносінах на другі план. Мяркуй пра людзей па іхніх справах, а не паводле шчырыні іхняй усмешкі. Пра справы можна даведацца з інтэрнэту, знаёміцца ж — неабавязкова. Калі ты не можаш напісаць кепска пра таго, хто робіць паскудствы або глупствы, ты — больш не журналіст. Колькі сувязяў, грошай, сяброў ты б пры гэтым не меў.

8. Падрыхтуйся на твае просьбы аб інтэрв’ю заўжды і ўсюды пачуць «не». Падрыхтуйся да таго, што здымаць тут нельга нават у сельмагах. Усё, чым ты жывеш, парушае партызанскі лад жыцця ў гэтым грамадстве, дзе людзі па-ранейшаму баяцца выдаць гайдараўскую Ваенную Таямніцу. Твая праца — мысліць. Іх праца — маўчаць.

9. Нікому не кажы, што любіш сваю прафесію больш за жыццё, што яна надарае цябе вялікім дарам — зазнаваць эмоцыі і дзяліцца імі. Што няма нічога прыемней за той момант, калі вакенца Word ужо адчыненае, а ў сярэдзіне цябе кіпіць лава з цьмяных адчуванняў, якія зараз прымуць форму словаў. Маўчы пра тое, што не ўяўляеш сябе ні ў якой іншай справе, паколькі журналіст паводле сваёй сутнасці — адвечны вандроўнік, што блукае па прасторах чужых дыскурсаў і далёкіх краінаў.

10. Пры першай нагодзе даведайся, як перакваліфікавацца ў кантралёра або міліцыянера.

### ...паводле тэлевядоўцы Вольгі Данішэвіч

1. Зрабі камеру сваім найлепшым сябрам — прынамсі, на час запісу. Хітры аб’ектыў не падманеш — любая твая няшчырасць, штучнасць ці непадрыхтаванасць на экране будуць як на далоні. А таму:

2. Рыхтуйся і яшчэ раз рыхтуйся — любая спантаннасць патрабуе добрай падрыхтоўкі. Не вер, калі табе кажуць, што станеш перад камерай і само ўсё пойдзе. Пасля дзвюх гадзінаў пацення пад тэлевізійнымі лямпамі ўжо будзе не да імправізацыі, якраз тады загадзя напісаны тэкст станецца тваім шчаслівым паратункам.

3. Здзіўляй — без гэтага тваю перадачу пераключаць ужо пасля першай хвіліны са словамі «зноў гэтая нудота». Як працуеш на актыўнае пакаленне моладзі 2000-х, то мусіш уцяміць, што тэлевізар ужо не глядзяць, каб



**Вольга Данішэвіч**

журналістка і тэлевядоўца. Вяла музычныя перадачы «Падземка» і «Запальнічка» на тэлеканале «Белсат». Цяпер — рэдактар і выдавец публіцыстычных перадач.

забіць час або запоўніць цішыню ў пакоі, — для гэтага ёсць фільмы з нэту ды музыка ў кампе. Хочаш, каб глядзелі цябе, — будзь нечаканым, правакуй ды не паўтарай нікога.

4. Выйдзі да людзей — цяпер цяжка некага зацікавіць тэлевізійным прадуктам, прапануючы адно голую карцінку. Выйдзі па-за межы каробкі — зрабі стаўку на інтэрактыўнасць: сайт перадачы, конкурсы, ролікі і кантакты з нэту, — не грэбуй нічым, каб уста-

ляваць кантакт з гледачом.

5. Не спыняйся на дасягнутым. Поспех на экране не вечны. Сёння ты будзеш найлепшым вядоўцам, заўтра за тваю манеру стаяць перад камерай цябе абсвішчуць. Развівайся, шукай новыя тэндэнцыі ды інвестуй у сябе. Заняткі з лагапедам, дэнс-школа, праца дома перад люстэркам — межаў для самаўдасканалення няма.

6. Нясі пазітыў — і да цябе пацягнуцца. Негатыву вакол і так зашмат, каб шукаць яго яшчэ і на тэлеэкране.

7. Лаві свежыя трэнды, шукай новыя фэйсы і будзь гатовы перагледзець свае ўчарашнія ідэі для дасягнення лепшага выніку сёння.

8. Знешні выгляд — частка твайго поспеху. Будзь гатовы да смелых эксперыментаў, але памятай: тое, што ў жыцці глядзіцца супер, на экране часцяком — не вельмі. І наадварот. Таму лепш даверыцца прафесіяналу-стылісту.

9. Знешні выгляд-2: нават самы прафесійны візажыст не схавае трохдзённага недасыпу ды нястачы энергіі ў вачах. Выснова: давядзецца высыпацца ды сачыць за сваім графікам.

10. Рабі сваю справу з запалам і крэатыўна. Нават халодна-дыстанцыйны стыль паводзінаў на экране патрабуе вялікай заангажаванасці ды энергіі. Млявы, абыякавы вядоўца — добрая нагода, каб пераключыцца на іншы канал. Сучаснасць патрабуе дынамікі. І такім мусіш быць ты.

## ... паводле рэкламніка Андрэя Гнёта

1. Першае меркаванне — наймацнейшае і амаль заўсёды слушнае. Менавіта з першага позірку ты імгненна і несвядома ацэньваеш чалавека, учынак, сцэнар або кадр. Заблытаўся? Спыніся і прыгадай сваю першую думку і ацэнку.



**Андрэй Гнёт**

рэжысёр рэкламы і музычнага відэа. Скончыў журфак БДУ, паралельна працуючы ў СМІ, за што яго спрабавалі адлічваць амаль штосеместр. У 2005, разабраўшыся ў сваіх памкненнях і магчымасцях, стварыў разам з партнёрамі кінакампанію «Партызан прадакшн».

2. Будзь шчырым. Нічога так не выкрывае фальшывасць, як экран: карцінка і гук.

3. Прыгадай, што ведаеш ці бачыў — і зрабі інакшай. Нават калі табе згадаўся чыйсьці фільм, крэатыўная фішка або ідэя — не варта іх паўтараць. Рэмікс рэдка калі лепшы за арыгінал.

4. Давярай унутранаму голасу. Няхай ты дзесяць разоў памылішся і дзесяць разоў не меў рацыі — галоўнае, што ты зрабіў гэта сам.

5. Якім бы добрым ні было тое, што ты стварыў, абавязкова знойдуцца тыя, каму гэта катастрафічна не спадабаецца. Калі сляпа слухацца крытыкаў — будзеш кружляць па зачараваным коле: зрабіўшы смешнае сумным, пачуеш: «Гэта змрочна», зрабіўшы сумнае вясёлым, панясецца: «Гэта занадта смешна». У такіх выпадках лепей паўтараць правіла 4.

6. Прымай крытыку слушна і мужна. Не заўсёды варта пытацца: «А суддзі хто?»

7. Ніколі не абагаўляй тое, што стварыў. Бо заўжды можна зрабіць лепш.

8. Любі тое, што робіш. Якім бяздарным не падаваўся б праект, знайдзі ў ім тое, што ты палюбіш. Адно любячы, можна дабіцца поспеху.

9. Падчас здымак кліпа ніхто не павінны пацярпець. Тым больш жывёлы, яны — святыя.

10. Слова «немагчыма» не існуе. Ёсць перамовы, грошы, час, кампрамісы і яшчэ сотня інструментаў, якімі можна і варта карыстацца. Проста дзеля гэтага трэба адарваць свой азадак ад крэсла. А гэта — найскладаней.

## ... паводле мастака Адама Глобуса

Пра гэтыя правілы варта ведаць, але неабавязкова іх выконваць...

1. Рабі творы меншыя за кампутарны манітор, бо сэнсу ў большых памерах няма ніякага...

2. Абапірайся на слова...

3. Вер у мастакоўскую зорку і не паддавайся спакусам ніякай іншай веры...

4. Ведай: гісторыя мастацтваў складзена з рэчаў выпадковых, бо якасць твора не гарантуе яго захоўвання ў бязлітасным часе...

5. Любі натуру, бо табе не патрэбна ўдасканаленае навукоўцамі заўтра і святарскія абяцанні лепшага ці горшага жыцця пасля тваёй смерці...

6. Помні: каханне натхняе...

7. Не кажы, што мастак — першая і апошняя вольная прафесія, а ўсе астатнія — рабы, бо не зразумеюць...

8. Не разменьвайся на дробязь, бо талент — грошы...

9. Прадавай халтуру, але не спрабуй халтуру прада-



ADAM-HLOBUS.LIVEJOURNAL.COM

**Адам Глобус**

мастак, літаратар, выдавец. Глобус быў сузаснавальнікам рэвалюцыйнай культурніцкай суполкі «Тутэйшыя». У 1990-я зрабіўся каардынатнай постаццю культурнага кола. Ён — аўтар кнігі урбаністычнай паэзіі «Парк», зборнікаў прозы «Адзінота на стадыёне», «Сьмерць — мужчына», «Дамавікамэрон», «Толькі не гавары маёй маме», «Койданава», «сУчасьнікі», «Play.By».

ваць за мастацтва, хопіць таго, што прадаеш халтуру...

10. Стварай змястоўныя формы, бо няма формы без зместу, як няма зместу без формы...

P. S.

11. Найвышэйшае з мастацтваў — мастацкія паводзіны.

## ... паводле пісьменніка Уладзіміра Арлова

1. Сумнявацца, але перадусім давяраць сваёй уласнай інтуіцыі.

2. Ніколі не вынаходзіць рэцэптаў кшталту «як пісаць апавяданні» або «як пісаць вершы».

3. Абавязкова мець чарнавік.

4. Пісаць чарнавік асадкай, а перапісваць начыста на камп'ютэры. У першым і другім разе дзейнічаюць абсалютна розныя «механізмы» таго, што ўмоўна называюць творчасцю.

5. Чытаць напісанае ўголас (найлепей самому сабе).

6. Не дзяліцца планамі і сюжэтамі, бо тады здзейсніць іх будзе шматкроць цяжэй.

7. Не пісаць нападпітку.

8. Не пісаць уначы.

9. Умець радавацца поспеху калегаў (ведаю нямала тых, чый талент з'ела зайздрасць).

10. Памятаць, што адрозна ад каньяку рукапісы з гадамі не набіраюць новых зорачак.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Уладзімір Арлоў**

пісьменнік, гісторык. Аўтар кніг на гістарычную тэматыку «Краіна Беларусь», «Адкуль наш род», а таксама зборнікаў аповесцяў і апавяданняў «Ордэн Белай Мышы» і «Каханак яе Вялікасці». Творы Арлова перакладаліся больш чым на 25 моваў свету. Кнігі «Таямніцы полацкай гісторыі» і «Дзесяць вякоў беларускай гісторыі» (у суаўтарстве з Генадзем Сагановічам) увайшлі ў спіс 100 найбольш папулярных беларускіх кніг XX стагоддзя, складзены на падставе чытацкіх лістоў газетай «Наша Ніва». Неўзабаве мае выйсці кніга паэзіі «Усё па-ранейшаму, толькі імёны змяніліся».

## 10 запаветаў для маладых паэтаў паводле Андрэя Хадановіча

1. *Хай ня будзе ў цябе багоў*,
акрамя хараства радкоў.
Але нават з тых, што выйдуць прыгожа і шчыра,
*не рабі*, калі ласка, *куміра*.



**Андрэй Хадановіч**

паэт, перакладчык, філолаг. Выкладчык замежнай літаратуры, кіраўнік «Перакладніцкай майстэрні» ў Беларускім калегіуме. Старшыня Беларускага ПЭН-цэнтра. Аўтар кніг вершаў «Старыя вершы», «Лісты з-пад коўдры», «Землякі, альбо Беларускія лімерыкі», «Сто лі100ў на tut.by», «Бэрлібры». Вершы перакладаліся на 8 моваў, а сам Андрэй перакладае з шасці моваў.

2. *Не вымаўляй імя Госпада, Бога твайго, марна*:
банальныя рыфмы наогул гучаць бяздарна,
ды асабліва шкода нябог,
што бяздарна рыфмуюць «Бог».

3. *Памятай дзень святы*,
толькі суботу сваю вызначаеш не ты.
*Шэсць дзён працуй і рабі ўсякія дзеі твае*,
покуль муза не дастае.
А ў «суботу» прычэпяцца з нейкаю працай —
пасылай іх і музу мацай.

4. *Бацьку свайго і маці сваю паважай* —
і будзе ўчынкам тваім умалот і ўраджай,
але графаманіць пра маму — вялікае гора:
не ў кожнага выйдзе не горай за дзядзьку Рыгора.

5. *Не забівай* сімпатычных герояў:
хопіць і тых, што празаік накроіў.
Лепей часцей беражы сучбелліт
клавішаю «delete».

6. *Не чыні пералюбу*
з музамі папярэднікаў — высцерагайся клубу
для тых, каму за...
З табой — маладзейшая муза.

7. *Не крадзь* —
рукапісы не гараць:
пяць хвілін пацешыўся плагіятам,
а пасля твой унук адчувае сябе вінаватым.

8. *Не кажы ілжывага сведчання,* —
гавару маладому крытыку:
тусавацца — не хопіць печані,
калі ж хопіць — ідзі ў палітыку.

9. *Не прагні дому* творчасці *блізкага*.
(Лепей — рыжскага ці парыжскага.)

10. *Не прагні жонкі чужой*, ні яе палюбоўніка,
*ні раба, ні рабыні ягонай* ахоўніка,
ні літаратурных мурынак,
што працуюць на іншы рынак.
А на розных *валоў* і *аслоў*
увогуле шкода слоў.

## ...паводле фотамастака Андрэя Лянкевіча

1. Мастацкая фатаграфія — годны занятак, каб прысвяціць яму жыццё. Калі маеце магчымасць не займацца фотажурналістыкай — скарыстайцеся гэтым.

2. Аб'ектыўнай фотажурналістыкі не існуе. Не падманвайце сябе.

3. Цуд фатаграфіі вельмі просты — вы глядзіце на фотаздымак і бачыце зусім не тое, што фатаграфавалі. У гэтым і ёсць мастацтва фатографа — візуальны падман.

4. Калі вам няма чаго распавесці — не фатаграфуйце.

5. Каб пачаць фатаграфаваць, трэба чытаць, слухаць, глядзець фільмы.

6. Падзяляйце: гэтыя здымкі я раблю дзеля грошай, гэтыя — дзеля вопыту, гэтыя — каб пакінуць па сабе.

7. Будзьце Прафесіяналам ва ўсім.

8.СамаАдукацыя — пасля адукацыя, калі застанецца час.

9. Верце ў самога сябе і не верце, што ёсць «немагчымае».

10. Слухайце інтуіцыю — яна большая за меркаванне большасці.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Андрэй Лянкевіч**

фатограф, нарадзіўся ў 1981 у Гродне. Бакалаўр эканомікі (БДУ).



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Кандыдат у …

**Хто ж ён, беларускі Троцкі? Прыгледзімся бліжэй. Піша Аляксандр Фядута.**

У кожным складзе палітбюро (рэальнага, а не такога, як наша) абавязкова знаходзіўся левы альбо правы ўкланіст, супраць якога ўсе змагаліся як толькі маглі. І, паколькі ўсе змагаліся з адным, то раней ці пазней яго выцiскалі паза межы сталіцы. Так у свой час выціснулі Анатолія Тозіка. Так, ужо на памяці цяперашняга пакалення аналітыкаў, што на хаду забываюць не тое што пра Тозіка — пра Шэймана! — адправілі ў Віцебск Аляксандра Косінца.

## Медыцынскае свяціла

Да таго як уляпацца ў палітыку, Аляксандр Косінец зрабіў вельмі паспяховую кар'еру медыка. У 1982 годзе ён атрымаў дыплом аб заканчэнні Віцебскага медыцынскага інстытута, а ўжо праз дванаццаць гадоў быў доктарам медыцынскіх навук, а яшчэ праз год — прафесарам. Было Аляксандру Мікалаевічу на гэты момант усяго 37 гадоў. Для любога навукоўца атрымаць доктарскую ступень ў гэтым узросце ганарова, а ўжо для лекара — тым больш.

Ён быў маладым, энергічным, прагным да славы і вельмі працаздольным. Пра такіх гавораць: «У яго матор у задніцы». Не ведаю, у якім менавіта месцы ў маладога прафесара быў матор, але ўжо ў 1997 годзе ён узначаліў сваю alma mater у статусе рэктара. І — цалкам заслужана. Ён быў аўтарам ста друкаваных прац, з іх — некалькі манаграфій. Прычым манаграфій прафесійных — гэта ж не эканамічныя працы накшталт «Для блага советского человека» (Мн., 1980, у сааўт.) альбо «Опыт работы комсомольских организаций по привлечению молодежи к борьбе за повышение эффективности производства» (Мн., 1981). З такімі працамі ў нашай краіне нават да міністэрскага партфеля можна даслужыцца. А ў Аляксандра Мікалаевіча кнігі былі цалкам вартыя ўвагі прафесіяналаў — скажам, «Почечно-клеточный рак» (Віцебск, 2002) альбо «Протеиназы и их ингибиторы в гнойной хирургии и онкологии» (Віцебск, 2003). А што ў сааўтарстве, дык медыцына — справа вельмі нават калектыўная.

Невядома, як высока падняўся б Аляксандр Косінец у прафесійнай дзейнасці. І невядома таксама, хто і калі звярнуў увагу прэзідэнта на маладога і перспектыўнага рэктара. Але ў 2005 годзе ён быў прызначаны віцэ-прэм'ерам па сацыяльных пытаннях.

## Адмарозак ва ўрадзе

Гэта быў неймаверны ўзлёт. Круцей (мы не бярэм усенародна абіраных асобаў) быў толькі ўзлёт Віктара Ганчара ў 1994 годзе. Але, уласна кажучы, Ганчар гэтую самую пасаду і займаў пасля выбараў першага прэзідэнта краіны. І параўноўваць гэтых двух віцэ-прэм'ераў мы не бярэмся — скажам толькі, што, як і Ганчар, Косінец стаў ва ўрадзе «белай варонай».

Справа не ў навуковай ступені. У нас і Васіль Далгалёў у кандыдатах хадзіць, і Сяргей Сідорскі — доктар навук. Справа ў ступені «адмарожанасці».

Не любіць у нас улада слова «адмарозак». Сёння — не любіць. А вось у 1994 годзе Аляксандр Лукашэнка абапіраўся менавіта на «адмарозкаў». На тых, хто, паводле ягоных жа словаў, «адвязаўся — і пайшоў працаваць!» Їх імя ў подпісы збіралі, і ўлёткі раскідвалі. За ідэю.

Вось Косінец апынуўся ў 2005 годзе ва ўрадзе ў ролі такога «адмарозка». Толькі ён не ўлёткі раскідваў, ён стаў на пярэдні, прабачце за пафас, фланг барацьбы. Менавіта Аляксандру Мікалаевічу мы абавязаныя тым, што медыцына як галіна, якая абапіраецца на навуковыя веды і рэальны практычны досвед, у Беларусі ўсё яшчэ існуе.

Нічога не хачу сказаць кепскага пра нябожчыцу Людмілу Пастаялку. Імаверна, дарадцы ў яе былі храновыя. Бо тое, што начало рабіцца ў медыцыне пры ёй — калі найлепшых кардыёлагаў выціскалі з працы, а рэспубліканскі эндакрыналагічны дыспансер надумалі аб'яднаць з гразелячэбніцай, — з кім бы з дактароў-практыкаў я ні размаўляў, не атрымала станоўчай адзнакі. Але ўплыў сп-ні Пастаялкі ва ўрадзе чамусьці быў такі, што ёй ніхто не мог пярэчыць. Нават міністр фінансаў Мікалай Корбут, які ўвесь час знаходзіўся пад наглядам эндакрынолага, не здолеў абараніць гэты напрамак.

Косінец здзейсніў неймавернае. Можа, навуковая ступень і званне прафесара валодаюць нейкай магічнай сілай — ці проста сілы «бабулі» (як не называлі) пачалі здаваць, — але прызначэнне Аляксандра Мікалаевіча супала з адстаўкай Людмілы Андрэеўны. І хаця ўплыў яе ва ўрадзе нейкі час захоўваўся, так званыя «рэформы», пачатыя з яе падачы, пачалі хутка «адкручваць» назад. Не ўсё атрымалася — але і зроблена хапіла, каб медыцынская эліта пачала глядзець на Косінца з пэўнай надзеяй.

Ну, дапусцім, гэта б Косінцу даравалі. Урэшце, колькі ні кажы пра аўтарытэт, жанчын з міністэрскімі партфелямі ва ўрадзе мала, і дзейнічаюць яны на калег-міністраў крыху турботліва. І Пастаялку спісалі з радасцю, шчыра жадаючы ёй пры гэтым добрага здароўя. Але ён жа раздражняў яшчэ болей! Таму што паводле пасады віцэ-прэм'ера яму б сядзець і не высоўвацца, а ён высоўваўся — ды яшчэ і з ініцыятывамі. А калі ініцыятыву падтрымліваў прэзідэнт, то выконваць яе даводзілася ўжо нават тым, хто з ёй быў не згодны.

І вось у гэтых адносінах былі два «пакутнікі», якія ўспрымалі Косінца проста як Троцкага нейкага.

Першы — ягоны непасрэдны начальнік, прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі. На фоне спакойнага, вальяжнага, выканальнага Сяргея Сяргеевіча гэты віцебскі «ветэрынар з маторам» глядзеўся проста нейкім фантанам ідэй! Яму, здавалася, было больш за ўсіх трэба ва ўрадзе! А чаму гэта? Ён што — вышэй узляцець хоча? Дык малады ж яшчэ!

Але значна большую антыпатыю выклікаў прафесар Косінец у акадэміка Анатоля Рубінава, першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта. Рубінаў з вялікім задавальненнем займаўся ідэалогіяй — як ён яе разумеў — на ўзроўні напісання газетных артыкулаў пад звыклай рубрыкай «Навука і рэлігія». А па пасадзе яму даводзілася займацца яшчэ цэлым шэрагам пытанняў — у прыватнасці, дзейнасцю газет, вышэйшых навучальных установаў, навукай, культурай. І ўсё гэта неяк само па сабе ішло, і Рубінаву жыць не замінала, пакуль не з'явіўся ва ўрадзе гэты самы «дублёр» — а Косінец і сапраўды быў своеасаблівым дублёрам Рубінава, як у старой партыйнай сістэме віцэ-прэм'ер па сацыяльных пытаннях перасякаўся ў сваёй дзейнасці з адпаведнымі сакратарамі ЦК Кампартыі.

Карацей, хацеў ці не хацеў гэтага Косінец, але ён аб'яднаў у барацьбе з самім сабой такіх буйных і ўплывовых дзеячаў, што падзенне ягонае з урадавага Алімпу было справай практычна прадвырашанай і непазбежнай.

Але шанец ацалець у яго быў. І ўтрымаў бы Аляксандр Мікалаевіч свой віцэ-прэм'ерскі партфель у руках яшчэ на некаторы час. Калі б не адна цалкам незалежная ад яго акалічнасць.

І гэтая акалічнасць — выбух.

## Кадравы выбух

Калі пасля выбуху ў ноч з 3 на 4 ліпеня 2008 года Аляксандр Лукашэнка вырашыў абнавіць сваю каманду, ён некаторы час вагаўся. Памятаеце, паважаны чытач, была паўза — паміж адстаўкай Генадзя Нявыгласа і прызначэннем Уладзіміра Макея? Невялічкая такая, але ж была. Дык вось, гэта быў момант хістання кіраўніка дзяржавы. Ён ужо звыкся да ціхага Макея, які не замінаў, але яму быў даспадобы і гэты чортаў адмарозак — віцэ-прэм'ер. Зразумела, чым быў даспадобы: выбары на носе. Працаздольны, актыўны, загадаеш — зямлю грызці будзе. Але кіраўнік дзяржавы кепска ведаў усю гэтую навуковую публіку. І ён вырашыў параіцца з галоўным навукоўцам у сваім атачэнні.

А галоўным навукоўцам быў зусім не Мясніковіч. Галоўным навукоўцам быў Анатолій Рубінаў. Менавіта яму, як кажуць чуткі, і задаў Аляксандр Лукашэнка сакраментальнае пытанне:

— Каго прызначыць: Макея альбо Косінца?

...

Як Вы думаеце, шаноўны чытач, каго параіў Рубінаў?

Зразумець Рубінава можна. Ён быў ужо немаладым чалавекам, збіраўся сыходзіць з Адміністрацыі. Яму важна было забяспечыць лаяльнасць да сябе на ключавых пасадах — там, дзе з людзьмі, магчыма, давялося б вырашаць нейкія пытанні. А такіх пасадаў было дзве. Пасада рэктара БДУ — і гэта Васілія Стражава ляцела кудысьці ў кулуары беларуска-кітайскага сяброўства. І пасада кіраўніка Адміністрацыі — і тут лёс Косінца быў вырашаны. Таму што аніводны начальнік ніколі не забывае, хто мог заняць месца, якое ўсё-такі заняў ён.

Так «асколкам» таго памятнага «кадравага выбуху» закранула Аляксандра Косінца.

## Правакацыя

Далей высылка Косінца з Мінска была справай тэхнікі. Сапраўды, а каго ж яшчэ можна было накіраваць у Віцебск — замест Уладзіміра Андрэйчанкі, які заслужыў сталічную пенсію, — зорак з неба не хапаў, аднак галасаванне забяспечваў аж з 1994 года? А Косінец малады, энергічны, вобласць ведае — і вобласць яго ведае ...

Уласна, на гэта і разлічвалі.

Усё было цалкам лагічна. Макею дavailable даручылі вырашыць кадравую праблему ў беларускім дзяржаўным апараце. Утварылася вакансія ў губернатарскіх шыхтах. Макей прапанаваў Косінца. Канечне, Лукашэнка пагадзіўся.

Толькі вельмі наіўны чалавек не разумеў бы, што адбудзецца з Косінцам у затхлым віцебскім чыноўнічым коле. Ах, ты разумны? Ты прафесар? Ты ва ўрад трапіў? Ну-ну... Мы паглядзім, які-сякі ты прафесар і што ты цяпер зможаш — тут, у нас... У Віцебску. Тут яму ніколі не даруюць, што ён быў наверсе і ледзь не стаў фаварытам самога кіраўніка дзяржавы.

А да гэтага трэба яшчэ ведаць Косінца. Ён і тут пачаў выказваць ініцыятыву. Казалі, што нейкі малады клерк на яго асабісты загад напярэдадні ўжо першай нарады бегаў па Віцебску з фотаапаратам і здымаў, здымаў... А потым...

Вось мост рамантуецца! — Дык рамантуецца ж! — А колькі ён яшчэ будзе рамантавацца? Вы калі яго павінны былі адрамантаваць?

І па апараце папаўзло злавеснае:

— Выслужваецца, адмарозак...

А вось гэта было далёка не бяспечным. Бо апарат на Віцебшчыне быў сфармаваны Уладзімірам Андрэйчанкам за доўгія гады працы ў рэгіёне, і наколькі пераплецена тут усё, можна сабе толькі ўяўляць. Як можна сабе ўяўляць і тэлефонную размову:

— Аляксандр Мікалаевіч, што ты там зарываешся? Людзі працуюць — хай сабе працуюць ...

— Уладзімір Паўлавіч, ды я...

— Ну, вось і добра... Не чапай народ, не палохай без патрэбы ...

Я неяк напісаў, што прызначэнне Косінца было першым кадравым праколам Макея на пасадзе кіраўніка Адміністрацыі. Я не меў рацыі. Макей добра ведаў, што ён робіць. Троцкага ж таксама выслалі ў Казахстан. І Шалепіна саслалі ў прафсаюзы. І Лігачова накіравалі «на сельскую гаспадарку». А тут Косінец! Хай яшчэ радуецца! Маглі, і наогул, прызначыць дырэктарам кінастудыі!

## Дабіць, каб не рыпаўся!

Да Троцкага падсылалі Сікейраса. Шалепіна адправілі ў Лондан, папярэдне правентэляваўшы, чым справа скончыцца. Косінца падлавілі на звычайным славалюбстве навукоўца.

Яшчэ да накіравання Косінца на Віцебшчыну пачалася кампанія па выбарах членаў-карэспандэнтаў Акадэміі навук. І Косінец цалкам натуральна апынуўся адным з прэтэндэнтаў. Гэта нікога не здзіўляла. Прафесар, аўтар некалькіх манаграфій. Чалавек са значным кіраўнічым і педагагічным досведам, былы рэктар. Ды і

медыцынская частка Акадэміі гарой, гавораць, стаяла за «свайго» Косінца. У ім бачылі калі не выратавальніка галіны, дык, прынамсі, гаранта яе далейшага развіцця.

Не ведаю, праўда ці казка, але ў чыноўных колах круціцца чутка аб тым, як пазбыўся месца адзін з былых старшыняў ВАКа (Вышэйшай атэстацыйнай камісіі). Быццам, дакладваючы кіраўніку дзяржавы аб наваспечаных дактарах, ён недвухсэнсоўна намякнуў, маўляў, варта толькі Аляксандру Рыгоравічу пажадаць, і ...

... і на наступны дзень старшыня ў ВАКу быў ужо новы.

Калі гэта праўда, то варта адзначыць, што Аляксандр Лукашэнка не зрабіў адной з самых забаўных памылак у сваім жыцці. Мундзір галоўнакамандуючага, ён, прынамсі, у шафу павесіць можа, а навуковую ступень куды падзець?

Затое ён і загарэўся звышнатуральнай нелюбоўю да чыноўнікаў, якія выкарыстоўваюць службовае становішча для набыцця навуковых ступеняў і званняў. І калі яму паведамілі, што губернатар Косінец балатуецца ў членыкарэспандэнты, то падалі ўсё так, быццам бы гэта быў чарговы самазванец, які рвецца да навуковых лаўраў.

Хопіць, маўляў, з яго і прафесарства!

На тым і пастанавілі. Ударылі не проста па самалюбстве навукоўца — па рэпутацыі чыноўнікаў і, трэба проста сказаць, палітыка.

### Кандыдат у чальцы

Але і высланы з Мінска па прынцыпе «А раптам карак зламае!» Косінец працягвае заставацца пагрозай, якая вісіць над сталічнымі топ-чыноўнікамі. З губернатарскай пасады шлях ляжыць наўпрост альбо ў фатэль прэм'ера, альбо — кіраўніка Адміністрацыі. Гавораць, Уладзімір Саўчанка некалькі тыдняў таму адмовіўся пераязджаць у Мінск, з-за чаго кіраўнік не завітаў у Гродна падчас нядаўняга «аграбізіту». Губернатарам старэйшага пакалення добра: яны ўраслі ў свой фатэль і цвёрда ведаюць, што іх галоўная задача — забяспечыць выбары. А гэта яны ўжо ўмеюць.

Косінец, малады і перспектыўны, будзе са скуры вылузвацца, абы вярнуць страчаныя пазіцыі. Фармальна яго ўсяго толькі перасунулі па гарызанталі — але ён жа добра ведае, якая менавіта пасада яму прызначалася. І, нібы жабка, што трапіла ў збан са смятанай, будзе біць лапкамі, пакуль не саб'е масла і не выскачыць ізноў наверх.

З «кандыдатаў» — у «чальцы Палітбюро».

**Раней у цыклі:**

«Уладзімір Макей. Другі твар» № 14
«Наталля Пяткевіч. Русалка на аблоках» №16
«Юры Жадобін. Генерал мірнага часу» №17
«Сяргей Ткачоў. Чалавек–невідзімка» №18
«Пётр Пракаповіч. Будаўнік у банку» № 20
«Уладзімір Сямашка. Кандыдат на ўсе вакансіі» №22
«Андрэй Кабякоў. Бацька хрышчонага сына» №24
«Зянон Ломаць. Чалавек без якасцяў» №25
«Міхаіл Мясніковіч. Класік урадавай думкі» №27
«Леанід Анфімаў. Задачка з адным невядомым» №29
«Сяргей Мартынаў. Міністр замежнага гандлю» №31

# Палітрэкрут едзе вучыцца ў Амстэрдам

**Зміцер Жалезнічэнка паступіў у тамтэйшы Тэхнічны ўнівэрсітэт.**



**Такой, як сёння, колькасці студыёзусаў за заходняй мяжой наша краіна не мела нават у часы Скарыны.**

Зміцер Жалезнічэнка здаў у Кіеве тэст на веданне ангельскай мовы. Навучацца Зміцер будзе па-ангельску, таму тэставанне было апошняй умовай залічэння яго ў нідэрляндскую ВНУ.

Жалезнічэнку, абсалютнага выдатніка, выключылі з Гомельскага ўніверсітэта за ўдзел у грамадскай і палітычнай дзейнасці. Чым пазбавілі законнага права на адтэрміноўку ад вайсковай службы да сканчэння адукацыі. Праваабаронцы прызналі матывы выключэння абсалютна палітычнымі. Тады ўключыўся механізм «міжнароднай салідарнасці працоўных».

Зьміцер вучыўся ў Гомелі на праграміста. Зараз ён працягне адукацыю па той жа спецыяльнасці.

Зміцер набраў на тэсце 7,5 бала з магчымых 9, а для навучання досыць было атрымаць 6 балаў.

Пасля вучобы Дзіма цвёрда хоча вярнуцца ў Беларусь.

Усяго на сёння ў краінах ЕС і ЗША навучаецца некалькі тысяч студэнтаў з Беларусі. У тым ліку некалькі сотняў тых, хто пацярпеў за палітычныя погляды. Такой колькасці студыёзусаў за заходняй мяжой наша краіна не мела нават у часы Скарыны, які таксама скончыў прэстыжныя альма-матэр у Кракаве і Падуі.

**МБ**

# Чорт паблытаў

**Магілёўскага епіскапа спрабаваў забіць псіхічна хворы.**

«Чорт паблытаў!» — толькі так пакуль можна патлумачыць інцыдэнт у магілёўскім Трохсвяціцельскім кафедральным саборы.

Паводле словаў відавочцаў, 23 жніўня каля дзевяці гадзінаў раніцы епіскап Магілёўскі Сафрон увайшоў у храм, павярнуўся да прыхаджан, які падышлі для добраслаўлення. У гэты час да яго наблізіўся мужчына і дастаў нож, разлічваючы нанесці ўдар у сэрца. Але першы ўдар прыйшоўся ў жывот. Ад другога епіскап захінуўся рукой, у выніку чаго на ёй былі пасечаныя вены.

Злачынцу затрымалі вернікі і здалі міліцыі, а святара змясцілі ў Першую гарадскую клінічную бальніцу.

Як паведамілі ва Упраўленні ўнутраных справаў Магілёўскай вобласці, 36-гадовы мужчына, які здзейсніў узброены напад на святара, цяпер маўчыць. Сваю матывацыю супрацоўнікам міліцыі ён не тлумачыць. Як высветлілі аператыўнікі, ён ужо быў раней судзімы за крадзеж і зараз знаходзіцца на ўліку ў Магілёўскай абласной псіхбальніцы. Падчас вобшуку ягонай кватэры было знойдзена шмат царкоўных кніг. Ён таксама з'яўляецца пастаянным наведвальнікам службаў, якія праводзяцца ў Кафедральным саборы. У супрацоўнікаў міліцыі маюцца версіі адносна таго, за што гэты чалавек хацеў пазбавіць епіскапа жыцця, але яны пакуль не разгалошваюцца ў інтарэсах следства.

У дачыненні да мужчыны заведзеная крымінальная справа паводле артыкула 147 частка 1 «Наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання» КК РБ, якое карацца абмежаваннем волі на тэрмін ад 3 да 5 гадоў ці пазбаўленнем волі на тэрмін ад 4 да 8 гадоў. Але з улікам наяўнасці псіхічных адхіленняў пасадзіць яго наўрад ці ўдасца.

Сам епіскап прааперыраваны і змешчаны ў рэанімацыю. Аперацыя прайшла паспяхова, і ягонае жыццё знаходзіцца па-за небяспекай.

Дарэчы, напады на служыцелей праваслаўнай царквы не з'яўляюцца рэдкасцю. За апошнія гады здзейсненыя дзясяткі злачынстваў у дачыненні да святароў. Праўда, сумная статыстыка пакуль тычылася ў асноўным Расіі і Украіны, а таксама іншых краін, у якіх дзейнічаюць праваслаўныя храмы. У асноўным, інцыдэнты здараюцца з-за жадання злачынцаў пажывіцца дарагім убраннем храмаў. Нярэдкія і выпадкі, падобныя да здарэння з епіскапам Магілёўскім, калі напад здзяйсняе псіхічна хворы чалавек.

**Вольга Жарнасек**



**Епіскап Сафрон (Юшчук)** нарадзіўся 11 красавіка 1951 у в. Кацельня–Баярская Брэсцкай вобласці. У 1982 закончыў Духоўную семінарыю ў Ленінградзе, у 1986 — Ленінградскую Духоўную Акадэмію, пасля заканчэння якой быў залічаны ў Жыровіцкі манастыр. У 2001 архімандрыт Сафрон атрымаў епіскапскае пасвячэнне. У 2002 стаў епіскапам Магілёўскім і Мсціслаўскім.

## КРЫМІНАЛ

### Прыбіла мужа

Крымінальная справа заведзеная ў дачыненні да 28-гадовай прадавачкі аднаго з прадпрыемстваў. Яна на тэрыторыі Гандлёвага дома па вуліцы Ціміразева ў Мінску падчас спрэчкі ўдарыла свайго мужа нажом. Мужчына ў бальніцы.

### Збіў да смерці пенсіянера

У Барысаве 20-гадовы хлопец на вуліцы падчас сваркі збіў пенсіянера. Той памёр на месцы, а злачынца затрыманы.

### Раз у год і кій страляе

Ледзь не скончылася трагічна сварка паміж жыхарамі вёскі Катлоўка Астравецкага раёна. Мужчына, які зайшоў да 71-гадовага аднавяскоўца, аказаўся моцна параненым. Пенсіянер сцвярджае, што адбыўся самастрэл, а пацярпелы — што той выстраліў у яго з абрэза. На пенсіянера заведзена крымінальная справа паводле арт. 139 ч.1 «Замах на жыццё».

### Расказаў міліцыі, што тата забіў маму

22 жніўня ў РАУС звярнуўся 13-гадовы падлетак з вёскі Любяча Уздзенскага раёна. Хлопчык паведаміў, што бацька забіў маці. Сапраўды, увечары 31-гадовы мужчына на глебе рэўнасці вяроўкай задушыў сваю 34-гадовую жонку. Пасля чаго сам павесіўся.

### Махляр падмануў Мінаблвыканкам

Пракуратура Першамайскага раёна Мінска распачала крымінальную справу ў дачыненні да 28-гадовага мінчаніна за злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі. Ён уносіў змены ў акты праектных работ па будаўніцтве аўтастанцыі ў г.Стоўбцы, прычыніўшы шкоду Мінскаму аблвыканкаму ў памеры 37,8 млн рублёў.

### Беражыце дзяцей ля дарогі

22 жніўня, на змярканні, ля вёскі Буда-Лельчыцкая Лельчыцкага раёна 53-гадовы жыхар Гомеля на «Сітраене» збіў 8-гадовага хлопчыка. Той ехаў у спадарожным напрамку на ровары па краі праезнай часткі. Ад атрыманых траўмаў ён памёр на месцы.

**ВЖ**




**Пяць медалёў (адзін срэбраны і чатыры бронзавых) заваявала на этапе Кубку свету ў Мінску 16-гадовая гімнастка Меліта Станюта, праўнучка вядомай акторкі. Усё золата забрала расійская прыма Яўгенія Канаева.**

# «Воплі Відаплясава» праспявалі пад бел-чырвона-белым сцягам

22—23 жніўня ў Чарнігаве (Украіна) прайшоў III міжнародны музычны фестываль «Be Free». Рэпартаж **Сяргея Макарэвіча**.



У Гомелі ў суботу вакзалы былі запоўнены маладымі людзьмі з заплечнікамі і намётамі, спальнікамі і дыванкамі. Але білетаў да Чарнігава не было. Заставалася ехаць таксоўкай альбо аўтаспынам.

На мяжы стварыўся кіламетровы корак, у якім прыйшлося прастаяць тры гадзіны.

За гэты час дзесяткі чалавек пераходзілі мяжу пешкі, спадзеючыся на ўкраінскай тэрыторыі знайсці транспарт. Але аўтаспын аказаўся неэфектыўным. Таму шмат людзей проста прыехалі пад канец першага дня фестывалю, а некаторыя і ўвогуле прапусцілі выступы гуртоў.

### «Ляпісы» далі прыкурыць

Каля чарнігаўскіх вакзалаў сталі напагатове таксоўшчыкі. За 20—25 грывен яны прапаноўвалі адвезці да месца фэсту. Хоць яны і не разумелі, што адбываецца ў іх горадзе, але ўсведамлялі, што нешта важнае.

Арганізатары планавалі сабраць сёлета 20 тысяч чалавек. Ці спраўдзілася, сказаць цяжка. Але напачатку каля сцэны было мала людзей. Ці не паўторыць сёлетні Be Free лёс BelaMusic пад Мінскам? Абышлося. З кожнай гадзінай слухачоў рабілася больш. Толькі яны сядалі воддаль. Выступы першых гуртоў — «Небо для Себе», B:N, ZATOCZKA — іх не натхнілі. Людзі пачалі падцягвацца да сцэны, калі зайграў французскі гурт Vladivostok. А як выйшаў «Ляпіс Трубяцкі», чалавечае мора заштарміла. У скокі пусціліся ўсе.

Уседзець маглі хіба тыя, хто фізічна не мог падняцца. Нават бацькі з малымі дзецьмі на руках лезлі ў гушчу натоўпу. Пасля выступу «Ляпісаў» высветлілася, што ў тэхніка і гітарыста гурту зніклі дакументы.

### Скончалі праграму легенды

Другі дзень фестывалю быў не менш насычаным. З пачаткам людзей сабралася няшмат. Бяссонная ноч у намётавым мястэчку, выпітае напярэдадні... Большасць аддала перавагу адпачынку на траве.

— Сіські! Сіські! — пачалі скандаваць маладзёны, калі на сцэну выйшла Вольга Самусік і «Тарпач».

Але спевы Самусік расчаравалі. Вакалістка была відавочна не ў форме. Адбітак на няўдалы выступ наклала і тое, што перад канцэртам бубнач гурту згубіў барабаны, а гітарыст параніў руку.

Далей ігралі «Назад Шляху Немає», LitvinTroll, Imprudence, Падчас выступу польскага гурту Zero-85 знікла электрычнасць. На шчасце, ненадоўга. Скончалі праграму легенды: ULIS і «Воплі Відаплясава». Алег Скрыпка ў канцы выступу ўзняў бел-чырвона-белы і жоўта-блакітныя сцягі, што надта спадабалася слухачам.

### Be Free перастане вандраваць

Сёлета майкі з лагатыпам фэсту былі жоўтага колеру. Глядзелася, прынамсі, не так змрочна, як леташнія чорныя. Толькі на ўсіх маек не хапіла. Шмат хто хадзіў з намаляванымі на шчоках, руках, грудзях бел-чырвона-белымі і жоўта-блакітнымі сцягамі. Сустракаўся расійскі трыкалор. Былі і сапраўдныя сцягі. Найбольш нашых, нацыянальных.

Арганізатарамі Be Free выступілі «Беларуская музычная альтэрнатыва», ініцыятыва «Студфармат», «Еўрапейскае радыё для Беларусі». Яшчэ да пачатку фэсту гаварылася, што ў Чарнігаве ён будзе праводзіцца пастаянна. Добра было б: чарнігаўская пляцоўка лепшая за луцкую і львоўскую.

# «Ваўкі» Колбышава парвуць «Беларусьфільм»

Аляксандр Колбышаў зняў на «Беларусьфільме» антытаталітарную трагедыю. Малітву да яе напісаў Уладзімір Замяталін.



Аляксандр Колбышаў (злева) падчас здымкаў «Ваўкоў».

На ягоным стале — кніга Быкава. Партрэты кінамастакоў — на сценах.

«Вось, паглядзі, — кажа актор і рэжысёр Аляксандр Колбышаў. — Гэта ролік маёй стужкі. Толькі змантажаваў».

На экране — сцюжа і снег. Цёмны, страшны цягнік набліжаецца. Стрэлы і крыкі. Уцёкі палітычнага зэка. Ахоўнікі з аўчаркамі. Зіхоткае святло вогнішча. Людзі ў злядзянелай вёсцы. Паляванне на чалавека. Твары — з сумневамі і пакутай. Выбар. Ахвяра. Ваўчынае выццё.

Мароз па скуры. Не магу паверыць, што на «Беларусьфільме» такое магчыма.

А. Колбышава беларускія гледачы ведаюць пераважна як актора. Ён сыграў зухаватага партызана Штыркіна ў «Акупацыі» Кудзіненкі, працаваў у Брэсцкім драматычным тэатры.

Але, акрамя таго, Колбышаў — рэжысёр, вучань Віктара Турава. Ягоная кароткаметражныя фільмы «Ахвота жыць» паводле Шукшына і «Чорная скрыня» прасякнутыя трагізмам і адметныя трапнай акторскай гульнёй. На «Беларусьфільме» яму месца не знаходзілася. Прапаноўвалі здымаць «Шчыт Айчыны» і іншы сучасны трэш, а Колбышаў меў свае сюжэты — з сапраўднымі героямі і жарсцямі. Не рэалізаваўшыся, з'ехаў у Маскву працаваць «на серыялах».

«Раптам мне патэлефанавалі з кінастудыі, — распавядае Колбышаў. — Сказалі, што ў нас новы дырэктар Замяталін, прапануйце сцэнар. Я даслаў сцэнар «Ваўкоў», які падаваўся мне на нашай кінастудыі непрахадным. А мне сказалі запускацца з карцінай».

Але «Ваўкі» — стужка падкрэслена антытаталітарная. Фільм пастаўлены паводле аднайменнай аповесці Аляксандра Чакмянёва, напісанай у 1963 г. За яе пісьменніка цягалі ў КГБ.

«Ваўкі», дзе гэбісты палююць за чалавекам, перагукаюцца з быкаўскай «Аблавай».

«Мне не замінալі, — кажа Колбышаў. — Наадварот. Дарэчы, у фінале фільма будзе гучаць малітва, напісаная Замяталіным. Ён, калі ўбачыў змантажаваную версію, запрасіў да сябе, даў аркуш паперы. Кажа, паглядзі: падабаецца ці не? Мне спадабалася. Так што вуснамі дзяўчынкі, шапялявым голасам гучыць: «Даруй нам, Госпадзі... Выратуй нас, Госпадзі... і — захавай нас, Госпадзі, таму што мы людзі, а не звяры...»

Пасля «Узыходжання» Ларысы Шапіцькі «Ваўкі» Колбышава прэтэндуюць на ролю новай сучаснай кінатрагедыі, што працягвае традыцыі Быкава і Шукшына. Зрэшты, з карціны Шапіцькі ў фільм Колбышава перавандраваў і Уладзімір Гасцюхін у сваёй каронай ролі чалавека з раздушаным сумленнем.

Здача фільма запланаваная на 13 кастрычніка.

«Я да «Балота» Быкава прыглядаюся», — кажа на развітанне Колбышаў.

**Андрэй Расінскі**

# Немец піша кнігу пра Беларусь



Інга Петц — нямецкі журналіст, актыўны прапагандыст незалежнай беларускай культуры — прыехаў у Беларусь для збору матэрыялу пра новую кнігу. Грошы на яе падрыхтоўку ён атрымаў ад Фонда Роберта Боша.

«Беларусь — гэта не толькі Лукашэнка і Чарнобыль. Ёсць яшчэ цікавая культура, частка еўрапейскай», — кажа Інга Петц. Петц пачаў сваю вандроўку з Палесся.

Петц выдаў у Нямеччыне CD «The Red Book of Belarusian Music» (2006), ладзіў беларускія канцэрты і вечарыны ў Берліне, у тым ліку святкаванне 100-годдзя «НН» у 2006 г. І надрукаваў дзесяткі артыкулаў у СМІ.

Цікава, што яшчэ летась яму не давалі візы ў Беларусь. Сёлета ж візу адкоылі без праблем. Ён тлумачыць тое палітыкай лібералізацыі.

**СМ**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ




**Віктар Шалкевіч. Блюз Вясна.** — Мінск, 2009 (Бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў»).

### Хіба песні чытаюць?

Барды даўно пачалі пісаць кнігі. «Чорны пісталет» Бартосіка, «Крывавы памол» Сокалава-Воюша, «Глыбіня дажджу» Камоцкага, «Каралева прыйдзе ноччу» Сом... Вось і Шалкевіч выдаў сваю кніжку.

«Блюз Вясна» — гэта вершы і песні, што сталі хітамі. Па іх пазнаюць Шалкевіча. «Смутны беларускі блюз», «Жлобская нацыя», «За сто крокаў ад Вострае Брамы». Але нельга чытаць песні, не пачуўшы іх у выканні аўтара. Не зможаце адчуць усяго каларыту. Хаця пра гэта выдаўцы паклапаціліся. Да кнігі прыкладзены дыск «Правінцыя». Увогуле, варта было б зрабіць не зборнік вершаў і песень, а суцэльны песеннік, з акордамі. Тады можна было б падпяваць не толькі слухаючы дыск з запісамі Шалкевіча, але і самому граючы на гітары.

Калі нехта не любіць паэзію, але любіць Шалкевіча, той набудзе гэты зборнік. Хто не ўпадабаў барда Шалкевіча, але любіць дасціпны беларускі гумар, якім насычаны яго песні, абавязкова прыдбае кніжку. Ніхто не застанецца незадаволеным.

**СМ**

# Боршч кіпіць

**Традыцыйная кухня — самая экалагічная і эканамічная для свайго рэгіёну. Яна грунтуецца на мясцовых прадуктах і мясцовай спецыфіцы. Наталка Бабіна распачынае новы цыкл публікацый пра беларускую кухню — сапраўдную-сапраўдную, правераную часам.**



Мая бабуля гатуе два віды баршчу — «такі» і «чырвоны». «Такі» — гэта тое, што ў расійскіх кулінарных кнігах называецца «щи из капусты», а «чырвоны» — «борщ украинский». Сёння імжыць, сонца, якое ўстае, толькі ледзьве прабіваецца скрозь хмарную смугу — будзе халаднаваты дзень, таму згатуем чырвоны — ён больш наварысты і каларыйны. Фасоля для яго замочана яшчэ з вечара.

Дзе там наша мяса? Дастаем з замарозкі кавалак свініны памерам з кулак — гэтага дастаткова на добрую каструлю — і закідаем разам з фасоляй у рондаль з халоднай вадой, хай закіпае.

Цяпер бярэмся чысціць бульбу — яна нам прыдасца і для баршчу, і на другую страву.

Дык вось, не верце, калі гавораць, што для прыгатавання смачнай стравы самае важнае — *як* гатаваць. Найважнейшае ў гэтай справе — *з чаго* гатаваць. Калі прадукты смачныя і якасныя, самая простая ежа атрымаецца — з пальцамі з'ясі. Цалкам справядліва і для баршчу.

Таму вельмі важна, якое менавіта мяса мы выкарыстоўваем. Гэта можа быць рабрынка з костачкай, кавалак лапаткі ці кумпяка абавязкова са скуркай, брушынка з перарослінкай — галоўнае, каб жывёлу добра кармілі і не шпігавалі антыбіётыкамі. Найлепшае мяса — з хатняй гаспадаркі.

Абазнаныя людзі кажуць, што найсмачнейшае мяса атрымліваецца, калі свінню кармілі печаным хлебам, зелянінай, бульбай. На жаль, на мінскіх рынках купіць такое мяса немагчыма: тут пад відам «хатняга» прадаецца выключна мяса з вялікіх комплексаў і фермерскіх гаспадарак, дзе жывёла атрымлівае толькі камбікорм і ваду. Таму, калі вам важна, што ядуць вашыя хатнія, за мясам варта выправіцца за кальцавую, у невялікія гарадкі: Бегам'е, Вілейку. Або Ракаў, дзе таксама адбываюцца штотыднёвыя кірмашы.

Да таго ж, атрымаеце асалоду ад самой паездкі ў мілы беларускі гарадок і ад кантактаў з беларусамі. Але і тут шмат перакупшчыкаў, таму, павольна ідучы паміж мясных радоў, прыглядайцеся не толькі да мяса, але і да тых, хто яго прадае.

Перакупшчыкаў лёгка вылічыць: выглядаюць яны не так, як сяляне. Перакупшчыкі звычайна гаваркія, актыўна «ўпарваюць» свой тавар, бажацца і нават хрысцяцца ў пацвярджэнне таго, што мяса якаснае. Прычым мяса ў іх зазвычай выглядае вельмі прывабна: прыемнага ружовага колеру, мясныя валокны вялікія, шкурачка абсмаленая. Але, калі добра прынюхацца, яно мае ледзь-ледзь прыкметны непрыемны пах мачы... Пры варцы такога мяса непрыемны пах узмацняецца, само мяса мае кіславаты смак, а пры смажанні кавалкі ўсмажваюцца амаль удвая і робіцца цвёрдымі. Нам такое мяса непатрэбна. Праходзім далей.

А вось стаіць загарэлы мужычок, ага, галава свіная на прылаўку адна, а кавалкі сала ў яго «дзвізяць» — трасуцца, як жэле. (Ой, успомніўся шыкоўны анекдот: «Кот Васька адчыняе дзверцы халадзільніка, а там жэле трасецца. Васька кажа: «Не трасся, жэле, я па кетчуп!».) Мужычок адразае кавалачак скуркі і задуменна жуе. Хутчэй сюды, пакуль не перахапілі! Тут запасемся добрым мясам надоўга — толькі, канечне, агледзім добра і панюхаем той кавалак, што нам прыглянуўся.

...Ага, мяса тым часам закіпела. Цяпер пасолім яго — мяса любіць соль, і пад уздзеяннем гэтага пачуцця аддасць булёну найлепшае, што ў ім ёсць — і дамо мясу паварыцца з паўгадзіны, а самі бярэмся за нарэзку гародніны для баршчу.

Так, і бульба пачысцілася — вымыем яе і ставім варыць (штукі чатыры адкладаем ў халодную ваду — спатрэбіцца потым для баршчу).

З гароднінай справа, як і з мясам: яна можа быць вельмі рознай на смак, у залежнасці ад таго, дзе расла і як вырошчвалася. Самая смачная — з пясчанай глебы сонечнай і цёплай Берасцейшчыны. І бурачок, і бульбачка, і капустка, і моркаўка, і памідоры, і перац, і часначок з цыбулькаю — усё, што нам спатрэбіцца для баршчу — на Берасцейшчыне мае нашмат мацнейшы смак і водар, чым гародніна з гліністых і макраватых палеткаў Міншчыны.

Бурачок для баршчу — таксама памерам з кулак. Дробна рэжам яго — і ў булён. Большасць кулінарных кніжак прыводзяць рэцэпты, дзе бурачок для баршчу трэба націраць на тарку і, як і астатнюю гародніну, абсмажваць на алеі ці туку. Гэта робіцца для таго, каб узмацніць іх смак. Можна, вядома, зрабіць і так, але боршч тады будзе больш «аднародны», у ім згубіцца смак інгрэдыентаў як такіх. У тым жа баршчу, які мы варым зараз, кожная гародніна свой смак захавае.

Карацей, яшчэ хвілін праз 20, калі бурачок памякчэе, рэжам бульбу пласцінкамі — туды ж, тады моркву яшчэ, капусту дробна нашынкуем — і ў кіпень. Аднойчы пляменнік, назіраючы, як я сяку для баршчу ўсё, што знаходзіцца дома з гародніны, параіў мне і гурок туды парэзаць. Гурок — не ведаю, не спрабавала, а вось кабачкі ці патысоны, нарэзаныя кубікамі, будуць цалкам да месца. Калі гародніна троху памякчэе, дабаўляем яшчэ нарэзаны кубікамі салодкі перац — а тады агеньчык трэба зрабіць маленькім-маленькім, каб боршч не віраваў, а толькі трошку-трошку кіпеў. Гэта акалічнасць — лёгкі агонь — вельмі важная!

А вось памідор і цыбулю варта троху падсмажыць. Калі мяса было любавым — смажце на шкварачках ці туку, калі тлустым — трошкі змажце патэльню алеем. Цыбулю кладзіце канечне — яна дадае баршчу спецыфічнага смаку, а сама зробіцца салодкай. Ну і памідоры — гэта тое, без чаго баршчу добрага не зварыць, таму рэжце на патэльню не шкадуючы. Калі кавалачкі памідораў памякчэюць, а кубікі цыбулькі стануць празрыстымі — зажарку ў боршч. І не забудзьцеся абліць разы два патэльню булёнам — каб змыць у боршч самае смачнае.

А колькі чаго класці — справа густу. Мне асабіста падабаюцца густыя баршчы, такія, у якіх лыжка стаіць.

Ой, бульба зварылася! На патэльню, якая якраз вызвалілася ад зажаркі, наліваем трохі алею — і высыпаем туды адвараную бульбу. Зараз прыгатуем «смалюхі». На алеі, на сярэднім агеньчыку, падсмажваем бульбу, пакуль не зробіцца на ёй залацістая, смачненькая, хрумсткая скарыначка, тады перавяртаем — і падсмажваем другі бок. Можна (і яшчэ лепш) падсмажваць на скварачках, асабліва калі мы набылі сала ў таго самага мужычка...

Пакуль бульба падсмажваецца, даводзім да смаку наш любімы боршч. Каштуем. Дадаем, калі трэба, троху солі. Плюс-мінус палову сталовай лыжкі воцату. Можа, трохі яшчэ дадаць? Перцу чорнага і чырвонага. Дробна нарэзанага часначку. Чагосьці не хапае? Дадайце чвэрць чайнай лыжкі цукру — у такіх мізэрных колькасцях ён узмацняе смак. Ага, яшчэ здрабнёнага кропу і пятрушкі. А вось лаўровага ліста я не кладу — гарчыць у баршчы, па-мойму. Ну, самае тое!

Дастаём з баршчу мяса і кладзем яго ў патэльню да бульбы.

Чую, у доме пачынаюць варушыцца. Вядома, такі пах! Боршч, бульбачка, яшчэ кампот, які зварыўся паміж справамі. Ранішнія хатнія справы муж і дзеці парабілі, ехаць пара: на працу, вучобу, у дзіцячы садок... Зараз паснедаюць — і ў паход. Добры боршч з раніцы — лепшы за любую каву і, несумненна, за любы бутэрброд. Так, я прытрымліваюся такой сістэмы харчавання, якая раней была паўсюднай у Беларусі, а зараз робіцца рэдкасцю: на сняданак — гарачыя стравы, на абед і полудзень — перакусы, на вечар — зноў паўнавартасная гарачая ежа. А што можа быць паўнавартасней за боршч?

Па радыё гучыць Yesterday. Зрабіць хіба галасней?

### Боршч

На каструлю баршчу сярэдніх памераў (3—4 літры) спатрэбіцца:

кавалак мяса з кулак;

1/2 шклянкі фасолі;

1—2 невялічкія бурачкі;

1/8 качана капусты сярэдніх памераў;

3—4 бульбіны;

1 моркаўка;

2—3 памідоры;

1 салодкі перац;

2—3 зубчыкі часнаку;

зеляніна кропу, пятрушкі;

соль, молаты перац, воцат, цукар на смак.

Фасолю замачыць на ноч. Мяса, фасолю пакласці ў халодную ваду, давесці да кіпення, пасаліць і варыць на маленькім агні амаль да гатоўнасці мяса. Дадаць ачышчаную здрабнёную гародніну і нашынкаваную капусту, варыць да гатоўнасці інгрыдыентаў. Давесці да смаку, дадаўшы зеляніну, часнок, спецыі.

Можна падаваць са смятанай.

### Бульба-«смалюхі» да баршчу

10–12 бульбін, соль, алей ці тук

Бульбу абабраць, адварыць амаль да гатоўнасці, абсмажыць на алеі ці туку да залацістай скарынкі.

Боршч кіпіць.
Боршч кіпіць, аж разлягаецца,
Дом пад гэта прачынаецца —
Што боршч кіпіць,
І Дом стаіць...
Боршч кіпіць.

# Першыя бомбы на Беларусь упалі ў 1939-м

Усе прызвычаіліся, што апошняя вайна прыйшла ў Беларусь у чэрвені 1941 года. На такое ўяўленне дзесяткамі гадоў працавала савецкая прапаганда. Між тым, першыя бомбы ўпалі на беларускія гарады ў верасні 1939-га. І першыя пахаронкі прыйшлі тады. Пры вялікай ролі ў гэтым Крамля.

### Янка Брыль бараніў Вестэрплятэ

1 верасня вайна пачалася для шматлікіх беларусаў, што служылі ў польскім войску. Прыкладам можа служыць лёс Народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля. Ён удзельнічаў у баях польскай арміі на Вестэрплятэ, у самым пекле. Трапіў у палон, а пасля ўцёкаў на Радзіму актыўна ўдзельнічаў у партызанскім руху.

Нямецкая авіяцыя бамбіла Беласток, Баранавічы, іншыя гарады. Нават у маленькіх вёсках, такіх як Страдзічы Брэсцкага раёна, захаваліся цэлыя могілкі ахвяраў тых першых нямецкіх налётаў.

### Першая абарона Брэсцкай крэпасці

Наземныя войскі штурмавалі Брэсцкую крэпасць. Частка беларускага насельніцтва вітала надыход нямецкай і савецкай армій. Аднак іншая частка была вернай польскай дзяржаве. Хтосьці ўспрымаў яе як сваю. Хтосьці — проста заставаўся верным прысязе.

Нямецкае кіраўніцтва разлічвала хутка і без вялікіх стратаў захапіць Польшчу, аднак рэалізаваць гэты план не ўдалося. Адна адчайная абарона Варшавы зацягнулася ад 8 да 28 верасня. Але ўжо 8 верасня міністр замежных справаў СССР Молатаў павіншаваў Нямеччыну з поспехамі. 17 верасня Чырвоная армія пяройдзе савецка-польскую мяжу.

Пасля канчатковага паражэння вялікая колькасць афіцэраў польскай арміі здалася ў савецкі палон, разлічваючы, што ён для іх будзе больш бяспечным, чым палон нямецкі. Аднак такім чаканням не было наканавана спраўдзіцца.

### Пачыналі разам

23 верасня ў Брэсце прайшоў супольны парад савецкіх і нацысцкіх войскаў. Пасля будзе рэалізацыя пакта Молатава-Рыбентропа: захоп немцамі малых краінаў Еўропы, акупацыя саветамі Балтыі і Бесарабіі, стварэнне марыянетачных органаў улады на занятых тэрыторыях. Пасля правальная Фінская вайна, калі малой краіне ўдалося стрымаць націск Чырвонай арміі. Пасля — першыя гітлераўскія і сталінскія дэпартацыі з занятых земляў. І толькі пасля здарыцца 22 чэрвеня, калі Сталін нарэшце ўсвядоміць, з кім меў справу.

**Алесь Пілецкі**

### Вечная памяць 14 тысячам ахвяраў

Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый Беларусі 23 жніўня ўшанавалі памяць ахвяраў сталінізму ў мемарыяльным комплексе «Катынь», які знаходзіцца ў Смаленскай вобласці Расіі.

Каля 80 чалавек выехала ў нядзелю раніцай з Мінска ў мемарыяльны комплекс «Катынь». Еўрапейскі дзень ахвяраў таталітарных рэжымаў, прызначаны ПА АБСЕ на 23 жніўня, у гэтым годзе быў сонечным. Аднак, нягледзячы на добрае надвор'е, настрой у беларусаў быў змрочны. Мы апынуліся на месцы нацыянальнай трагедыі некалькіх народаў.

Мемарыял збудаваны на месцы, дзе ў 1940 годзе былі расстраляныя 4343 афіцэры Войска Польскага. Яшчэ 6500 чалавек былі расстраляныя ў лагеры ў Асташкаве і 3920 — у Старабельску. Сярод 14 тысяч забітых, акрамя палякаў, былі таксама ўкраінцы і беларусы. Прыблізна чвэрць забітых былі родам з Заходняй Беларусі.

Сёння на месцы магілаў тысяч людзей — вялізны мемарыяльны комплекс. Акуратныя дарожкі, крыжы і помнікі, а таксама сцяна з імёнамі ахвяраў. Беларусы паклалі кветкі і заспявалі «Магутны Божа». Катынскі лес, спакойны і змрочны, адгукнуўся памінальным звонам.

Размаўлялі пра Катынь, але балела і за Курапаты. Там, нягледзячы на пастанову Савета Міністраў БССР ад 18 студзеня 1989 г., яшчэ так і не пабудаваны помнік.

**Настасся Шамрэй**

# Прамова Сталіна на Палітбюро 19 жніўня 1939 года

«Неабходна зрабіць усё, каб гэтая вайна цягнулася як мага даўжэй».

Публікуецца паводле артыкула Т.Бушуевай у часопісе «Новый мир» 1994, №12. Тэкст прамовы захоўваецца ў Цэнтры захоўвання гісторыка–дакументальных калекцый, куды ён трапіў з былога Асобага архіва СССР, ф. 7, оп. 1, с. 1223.



Пытанне міру ці вайны ўваходзіць у крытычную для нас фазу. Калі мы заключым дамову аб узаемадапамозе з Францыяй і Вялікабрытаніяй, Германія адмовіцца ад Польшчы і пачне шукаць спосаб суіснавання з заходнімі краінамі. Вайна будзе перадухілена, але ў далейшым падзеі могуць прыняць небяспечны для СССР ход. Калі мы прымем прапанову Германіі аб заключэнні з ёй пакта аб ненападзенні, яна, імаверна, нападзе на Польшчу, і ўмяшанне Францыі і Англіі ў гэтую вайну стане непазбежным. Заходняя Еўропа спазнае сур'ёзныя ўзрушэнні. У гэтых умовах у нас будзе шмат шанцаў застацца ў баку ад канфлікту, і мы зможам спадзявацца на наша выгаднае ўступленне ў вайну.

Вопыт апошніх дваццаці гадоў паказвае, што ў мірны час немагчыма мець у Еўропе камуністычны рух, моцны да такой ступені, каб бальшавіцкая партыя магла захапіць уладу. Дыктатура гэтай партыі становіцца магчымай толькі ва ўмовах вайны. Мы зробім свой выбар, і ён зразумелы. Мы павінны прыняць нямецкую прапанову і ветліва адаслаць назад англа-французскую місію.

Першай перавагай, якой мы дасягнем, будзе вынішчэнне Польшчы да самых падыходаў да Варшавы, уключна з украінскай Галіцыяй. Германія дае нам поўную свабоду дзеяннаў у Прыбалтыйскіх дзяржавах і не мае нічога супраць вяртання Бесарабіі СССР. Яна гатовая аддаць пад нашу зону ўплыву Румынію, Балгарыю і Венгрыю. Застаецца адкрытым пытанне, звязанае з Югаславіяй.

У той самы час мы павінны прадбачыць наступствы, якія будуць вынікаць як з паражэння, так і з перамогі Германіі.

У выпадку яе паражэння непазбежна адбудзецца саветызацыя Германіі і будзе створаны камуністычны ўрад. Мы не павінны забываць, што савецкая Германія акажацца перад вялікай небяспекай, калі гэтая саветызацыя будзе вынікам паражэння Германіі ў хуткаплыннай вайне. Англія і Францыя будуць яшчэ дастаткова моцнымі, каб захапіць Берлін і знішчыць савецкую Германію. А мы не будзем у стане абараніць нашых бальшавіцкіх таварышаў у Германіі. Такім чынам, наша задача заключаецца ў тым, каб Германія магла весці вайну як можна даўжэй, з мэтай уцягвання Англіі і Францыі ў зацяжную вайну, пасля якой яны будуць не ў стане разграміць савецкую Германію.

Трымаючыся пазіцыі нейтралітэту і чакаючы свайго моманту, СССР будзе аказваць дапамогу цяперашняй Германіі, насычаючы яе сыравінай і харчаваннем. Аднак, зразумела, наша дапамога не павінна пераўзыходзіць пэўныя межы, каб не падрываць нашу эканоміку і не змяншаць магутнасць нашай арміі. У той самы час мы павінны весці актыўную камуністычную прапаганду, асабліва ў англа-французскім блоку і пераважна ў Францыі. Мы павінны быць гатовымі да таго, што ў гэтай краіне ў ваенны час партыя будзе вымушаная адмовіцца ад легальнай дзейнасці і перайсці ў падполле. Мы ведаем, што такая праца патрабуе шматлікіх ахвяр, аднак нашы французскія таварышы не будуць сумнявацца. Іх задачамі ў першую чаргу будуць разлажэнне і дэмаралізацыя арміі і паліцыі. Калі гэтая падрыхтоўчая праца будзе выканана ў патрэбнай форме, бяспека савецкай Германіі будзе забяспечана, а гэта будзе спрыяць саветызацыі Францыі. Для рэалізацыі гэтых планаў неабходна, каб вайна працягнулася як мага даўжэй, і менавіта ў гэты бок павінны быць скіраваныя ўсе сілы, якімі мы валодаем у Заходняй Еўропе і на Балканах.

Разгледзім цяпер іншае меркаванне – перамогу Германіі. Некаторыя трымаюцца думкі, што гэтая імавернасць прадстаўляе для нас сур'ёзную небяспеку. Доля праўды ў гэтым сцверджанні ёсць, аднак было б памылкова думаць, што гэтая небяспека будзе настолькі вялікай і блізкай, як некаторыя яе ўяўляюць. Калі Германія атрымае перамогу, яна выйдзе з вайны занадта вычарпанай, каб пачаць узброены канфлікт з СССР у бліжэйшыя дзесяць гадоў. Яе асноўнай задачай будзе кантроль за пераможанымі Англіяй і Францыяй з мэтай недапушчэння іх аднаўлення. З іншага боку, Германія-пераможца будзе валодаць вялікімі тэрыторыямі і на працягу шматлікіх дзесяцігоддзяў яна будзе занятая іх «эксплуатацыяй» і ўсталяваннем там германскага парадку. Імаверна, што Германія будзе вельмі занятай у іншым месцы, для таго каб павярнуцца супраць нас. Ёсць і яшчэ адна рэч, якая паслужыць умацаванню нашай бяспекі. У пераможанай Францыі камуністычная партыя будзе заўсёды вельмі моцнай. Камуністычная рэвалюцыя непазбежна адбудзецца, і мы зможам выкарыстаць гэты факт для таго, каб прыйсці на дапамогу Францыі і зрабіць яе нашым саюзнікам. Пазней усе народы, што трапілі пад «абарону» Германіі, таксама стануць нашымі саюзнікамі. У нас будзе шырокае поле дзейнасці для развіцця сусветнай рэвалюцыі.

Таварышы! У інтарэсах СССР — Радзімы працоўных, — каб вайна пачалася паміж Рэйхам і капіталістычным англа-французскім блокам. Неабходна зрабіць усё, каб гэтая вайна цягнулася як мага даўжэй у мэтах вычэрпвання рэсурсаў у абодвух бакоў. Менавіта па гэтай прычыне мы павінны пагадзіцца на заключэнне пакта, прапанаванага Германіяй, і працаваць над тым, каб гэтая вайна, аднойчы абвешчаная, працягнулася максімальную колькасць часу. Трэба будзе ўзмацніць прапагандысцкую працу ў ваюючых краінах для таго, каб быць гатовымі да часу, калі вайна скончыцца.

# Тарпа

**«Раней на тарпу выходзілі цэлымі вёскамі, як на фэст!» — прыгадвае Мікалай Шэўка, пенсіянер з вёскі Краснае, што на Карэліччыне. Ён узяўся прадэманстраваць умельства, што хутка можа знікнуць — саматужны працэс нарыхтоўкі торфу на паліва.**

Кожны школьнік на Карэліччыне ведае з курса прыродазнаўства, што сярод карысных выкапняў у тутэйшай мясцовасці па-за канкурэнцыяй знаходзяцца запасы торфу. У дзяцінстве я не без гонару маляваў у адмысловым атласе чорныя прастакутнікі побач з роднай вёскай — тут знаходзіцца істотная частка «чорных» запасаў раёна. Тутэйшыя тарфянікі цягнуцца ўздоўж рэчкі Сэрвач на некалькі кіламетраў. Большая частка іх выкарыстоўваецца мясцовым калгасам, а рэштай, парослай дзікім кустоўем, здаўна карысталіся людзі, нарыхтоўваючы тут на зіму паліва — тарпы, як кажуць мясцовыя. «Раней на тарпу выходзілі цэлымі вёскамі, як на фэст! Паміж ямамі адлегласць была на штых рыдлёўкі, столькі народу збіралася на нарыхтоўку. І ніхто тарфіны ў суседа не скрадзе, кожны сваю яміну ведаў», — прыгадвае Мікалай Шэўка, пенсіянер.

### Газ супраць торфу

«Старыя адыходзяць, на іх усё трымалася. А ў маладых ужо іншае на ўме», — з сумнай усмешкай кажа дзядзька Мікола, спытаны пра рыхтуючы пляцоўку пад нарыхтоўку «тарпы». Яшчэ за палякамі мясцовыя балоты былі асушаныя з дапамогай рыдлёвак. Працу працягнулі за саветамі. У выніку ўзнікла гіганцкая сістэма вялікіх і малых меліярацыйных каналаў. Нарыхтоўваць торф на паліва стала значна прасцей. Торфабрыкету яшчэ ніхто не ведаў, да лесу тут далекавата, таму торф быў асноўным відам паліва. Гэта быў самы росквіт нарыхтовак. На тарфянікі пачыналі прыязджаць у пачатку мая, да сенакосу. Наразалі на колькі вазоў, сушылі і адвозілі дамоў. Хто жыў бліжэй да тарфяніку, вазіў торф на падсцілку скаціне, на гарод. Першыя «здрады» пачаліся са з'яўленнем торфабрыкету. Самымі адданымі балоту заставаліся найбольш ашчадныя гаспадары. Колькі гадоў таму ў вёсцы з'явіўся газ. Гэта і вырашыла лёс «тарпы». Сёння па торф выбіраюцца адзін-два гаспадары з Краснага, якія не здолелі абзавесціся газавым ацяпленнем.

### Торф рэзалі раненька

«Я пачынаў капаць торф раненька, пакуль не прыпячэ. А там ляжаш у кустах і чакаеш халадок да вечара», — Мікалай Шэўка падпаліў цыгарэту. Верхні слой з травой на адзін штых рыдлёўкі зрэзаны і скінуты ў старую, напоўненую зялёнай ад раскі вадой яміну. Пляцоўка выраўненая шуфлем, можна пачынаць рэзаць торф. Робіцца гэта замацаваным на доўгім драўляным дзяржальне адмысловым нажом, надзвычай вострым.

«Канечне, востры! Не для каго ж рабіў, для сябе. Папрацуй тупым дзень-два, потым не разагнешся», — усміхаецца дзядзька. Рэжуць торф вертыкальна, вымаючы з зямлі доўгія, амаль паўметровыя цагліны. Пры гэтым сочаць, каб яны былі трывалыя, не развальваліся. Брак выкідаецца ў старую яміну. Свежыя тарфіны выкладваюцца на беразе пірамідкамі ў 4-5 паверхаў. Піраміды гэтыя перад дажджом накрываюць травой ці лазняком. Сушыцца будучае паліва некалькі тыдняў. У час сенакосу падсохлы торф адвозілі разам з сенам, якое нарыхтоўвалі побач. Сырэйшыя цагліны ізноў выкладалі ў пірамідкі.

Тарфянік — месца небяспечнае. Зацягнутыя водарасцямі і раскай, старыя яміны тояць небяспеку не толькі для дзяцей — у такой пасткі можа патануць і дарослы. Але галоўная бяда — пажары. Хто меў справу з палаючым тарфянікам, ведае, як цяжка перамагчы тут агонь. «На нарыхтоўках было строга з агнём, — кажа вясковец.

### «Прырода бярэ сваё»

«Багата звяр'я тут развялося: казуляў шмат, зайцоў, лісаў, дзікі часам набягаюць, ваўкі бліжэй да пушчы трапляюцца», — кажа дзядзька Мікола, выкладаючы чорныя, бліскучыя ад вады цагліны на беразе старой яміны. Аточаны калгаснымі палеткамі непраходны хмызняк — ідэальнае месца для дзікіх звяроў. Калі раней гэтае месца ажывала хоць на кароткі час торфанарыхтовак, то цяпер тут яшчэ больш глуха і нават вусцішна. І падаецца, што звярам тут робіцца цесна. У меліярацыйных каналах водзяцца шчупакі, налімы, язі. Некалі тутэйшы люд хадзіў па рыбу з кошыкам: працягнеш яго колькі метраў па вадзе — і маеш рыбы і на юшку, і на сушку. Цяпер за рыбакамі пільна сочыць ахова прыроды, але аматараў прайсціся па каналах з сеткай-таптухай не меншае.

Найбольшую шкоду мясцовай прыродзе чыніць сельская гаспадарка. У красавіку — у час тарфяных бураў — чорныя хмары тарфяного пылу ўздымаюцца на сотні метраў у вышыню. «Першае, што зрабіў бы, каб меў на тое паўнамоцтвы — засеяў бы тарфянік на гады травой», — казаў мне неяк мясцовы аграном. Ураджаі зерневых, атрыманыя на тарфяніках, не вартыя тых высілкаў, што даводзіцца штогод прыкладаць.

Старыя звычкі адступаюць пад наступам цывілізацыі. З аднаго боку — прырода бярэ сваё. З іншага боку, векавы звычай знікае. Прынамсі, пакуль ёсць людзі, якія ўмеюць капаць торф, кожны пры жаданні зможа пабачыць на ўласныя вочы, як гэта робіцца, а магчыма, і паспрабаваць сам. Магчыма, некалі саматужная нарыхтоўка торфу стане абавязковым пунктам экскурсійнай праграмы па Карэліччыне.

**Сямён Печанко, Карэлічы—Мінск**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ




**Геалагічныя запасы торфу**

ў Беларусі складаюць 4,3 млрд т (75% ад першапачатковых запасаў). Разведаныя 9200 радовішчаў торфу плошчай у межах прамысловай глыбіні залежы 2,54 млн га. Штогод здабываем 3 млн т торфу, з якіх 10% выкарыстоўваецца ў сельскай гаспадарцы, асноўная ідзе на выраб паліва. А яшчэ з торфу вырабляюць угнаенні, біястымулятары, кармавыя дрожджы, фільтры, сарбенты, фарбавальнікі драўніны, тарфяны воск, лекі, прадукты бытавой хіміі і інш. Праект Праграмы развіцця ААН і Глабальнага экалагічнага фонду ў Беларусі прадугледжвае аднаўленне 40 тыс. га парушаных тарфянікаў.

## АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

МЫ НЕ ВЯЗНІ!

*Уладзю Арлову, як найпрыязней.*

*Do you understand, my darling? Terviseks!*
У. Арлоў. Талінская галубка

Сяджу за лэптопам на вуліцы М.,
Пішу папулярную кнігу паэм,
Як раптам стук–стук! Гэта голуб за шклом
Не вельмі прыстойна махае крылом.

Крышу яму ў фортачку ўчорашні кекс,
А ён па–эстонску крычыць: «тэрвісэкс!»*,
Бы птушцы сваёй прапануе інтым
Ці вымавіць хоча: «Давай паляцім!

На Вільню! На Готланд! На Капры! На Кіпр!
Туды, дзе напішацца новы верлібр,
Дзе фаўна галубак — для файнага сну,
Дзе Горкаму Ленін сушыў прасціну,

Дзе ты сваю пляшку сухога віна,
Як меліяратар, асушыш да дна,
А хтось, не здаволены добрым вінoм,
Крывавую мэры б хлябтаў пад акном…

Хай дыхаюць пылам чужыя тамы.
Арлоў, мы — не вязні, а вязні — не мы!
Мы — вольныя птушкі! Пара, брат, пара!
Усё, што раней, — толькі спроба пяра…»

25 жніўня пісьменніку **Уладзіміру Арлову споўнілася 56 гадоў** (нар. у 1953 у Полацку). І гэты верш быў запісаны замест віншавання. Рэдакцыя НН далучаецца да віншаванняў Уладзіміру Аляксеевічу.

* «Вітаю» па–эстонску.




# Самы вялікі арт-фестываль у гісторыі Беларусі

**Ад 25 жніўня да 20 верасня ў сталічным Палацы мастацтваў** будзе праходзіць «Дах–9», які збярэ пад адным дахам каля 150 мастакоў з 11 краін. Арганізатарамі выступаюць мастакі і перформеры Алесь Родзін і Зміцер Юркевіч супольна з Саюзам мастакоў. На працягу шасці тыдняў на тэрыторыі найбуйнейшай выставачнай пляцоўкі Беларусі будуць суіснаваць многія жанры і віды мастацтва: жывапіс, скульптура, фатаграфія, перформанс, літаратура, музыка, тэатр, кіно, стрыт– і відэа–арт.

«Дах» праводзіцца дзевяты раз. Яго мастацкія акцыі праходзілі ў Мінску і Берліне ў асноўным з удзелам беларускіх і нямецкіх аўтараў.

Цэнтральнае месца на фестывалі зойме арт–праект «Ахвяры мастацтва».

Аўтарамі канцэпцыі таксама з'яўляюцца Родзін і Юркевіч. Упершыню праект быў прадэманстраваны вясной–летам 2008 года ў Цэнтры сучаснага мастацтва «Тахелес» у Берліне.

Штотыднёва на фестывалі будзе мяняцца экспазіцыя пластычных мастацтваў (жывапіс, фатаграфія і скульптура), штодзённа будуць праводзіцца канцэрты, выступленні перформераў і тэатральных труп.

Паводле слоў Алеся Родзіна, 80% праграмы фестывалю стварыў Зміцер Юркевіч. Дзякуючы яму, вызначыўся спіс музыкантаў, якія выступяць на мерапрыемстве. Сярод іх **«Князь Мышкін»**, **«Джамбі-бум»**, **«Гаротніца»**, **«Рацыянальная Дыета»**, **«СонцаКветкі»**, **«Гурзуф»**.

Уваход на фестываль з 11.00 да 17.00 будзе платным (4 тыс. рублёў), пасля 17.00 і да закрыцця — вольным.

**Адэля Дубавец, БелаПАН**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Гісторыя прадажнага кахання

Прыгажун Нікі (Катчар) карыстаецца нязменнай увагай жанчынаў. За кошт жанчынаў ён і жыве, пры гэтым не адмаўляецца ад дадатковых прыгодаў па–за межамі сваёй асноўнае працы. Аднойчы Нікі сустракае Хізэр — непрыступную аферыстку, якая шукае багатых кавалераў. Родныя душы проста створаныя адна для адной.

Карціна «Бабнік», якая рэкламуецца ў нас як эратычная камедыя — драма з сумным фіналам, дзе рэжацца праўда–матка пра галівудскія штампы і галівудскія мары. Але ў гэтым фільме пра прадажнае каханне стае і аголенага жаночага цела, і лос–анжэлескага гламуру.

Гэтыя складнікі мусяць задаволіць чыпсаедаў і дамачак бальзакаўскага веку. Маюцца і неабходныя камедыйныя моманты.

Але пасыл стужкі іншы.

Пекната, як тавар на продаж; юрлівасць — як тое, што ператварае чалавека ў рэч; мары, якія падманваюць.

Фільм варта глядзець дзеля апошніх 10 хвілінаў. Эштан Катчар — усё–такі актор, а не проста «Бабнік».

**Андрэй Расінскі**

**Бабнік** (Spread)
ЗША, 2009, каляровы, 97 хв.
**Рэжысёр:** Дэйвід Макензі
**Ролі выконваюць:** Эштан Катчар, Эн Хэч, Маргарыта Левіева, Себасцьян Стэн, Соня Рокуэл
**Жанр:** Драма з элементамі эротыкі
**Адзнака:** 6 (з 10)



## «Навальніца» феерверкаў

**«Навальніца» феерверкаў**

**28 — 30 жніўня ў гарналыжным комплексе «Лагойск»** пройдзе першы міжнародны фестываль феерверкаў «Навальніца». Выступы еўрапейскіх піратэхнічных камандаў падтрымаюць музыкай гурты **«J:морс»**, **«Ляпіс Трубяцкі»**, **«Палац»**, а таксама ды–джэі. Да пляцоўкі фестывалю можна дабірацца асабістым транспартам або на спецыяльным аўтобусе, які будзе курсаваць да фестывальнай пляцоўкі ад ст.м. «Усход».

## КАНЦЭРТЫ

**Камоцкі ў Карэлічах**

Канцэрт–сустрэча з беларускім бардам Алесем Камоцкім пройдзе **ў Карэлічах 27 жніўня (актавая зала Школы мастацтваў —плошча 17 Верасня, 1)**. **Пачатак а 16-й.** Уваход вольны.

**Рок па вакацыях**

**2 верасня ў «Рэактары» (вул.В.Харужай, 29)** — «Рок па вакацыях». Выступаюць: **Drum Ecstasy**, **Neuro Dubel**, **«Крама»**, **«БЕЗ БІЛЕТА»**, **«Авангардшкола»**, **«Змяя»**.

## ФУТБОЛ

**Бітва тытанаў**

**У панядзелак, 31 жніўня, на барысаўскім гарадскім стадыёне** — матч 17–га туру чэмпіянату Беларусі па футболе. БАТЭ (Барысаў) — «Дынама–Мінск». **Пачатак а 19-й.**

## ІМПРЭЗЫ

**«Вераснёвыя знічкі»**

**8 верасня ў канферэнц-зале Палаца мастацтваў (вул.Казлова, 3)** адбудзецца паэтычна–музычная вечарына «Вераснёвыя знічкі». Уступнае слова — Анатоль Грыцкевіч, гісторык і грамадскі дзеяч. Мяркуемыя ўдзельнікі: Леанід Дранько–Майсюк, Міхась Скобла, Ірына Хадарэнка, Павел Надольскі, Аксана Спрынчан, Сяржук Сыс, Галіна Дубянецкая, Віктар Шалкевіч, Эдуард Акулін, Яраш Малішэўскі. Заключнае слова — Уладзімір Арлоў. **Пачатак а 19-й.** Уваход вольны.

**Юры Жыгамонт і Зміцер Бартосік**

**28 жніўня на аграсядзібе «Зарачаны»** адбудзецца творчая сустрэча з акторам і тэлевядучым Юрыем Жыгамонтам ды пісьменнікам і бардам Змітром Бартосікам. У праграме, якая пачнецца **а 18-й**, — вершы, апавяданні, песні, а таксама дэманстрацыя фільма «Дудзічы» з тэлевізійнай серыі «Новыя падарожжы дылетанта».

**«Культурная эвалюцыя» пад Бабруйскам**

Трохдзённы музычна–паэтычны фестываль «Культурная эвалюцыя» пачнецца **4 верасня ў сядзібе «Вішнёвы сад» пад Бабруйскам.** Майстар–клас для аўтараў–выканаўцаў і паэтаў правядуць Алесь Камоцкі, Зміцер Вайцюшкевіч і Надзея Кудрэйка. **5 верасня** на адкрытай пляцоўцы адбудзецца дзённы канцэрт аўтарскай песні для дзяцей.

## ВЫСТАВЫ

**Беларусі з любоўю**

**У Літаратурным музеі імя М.Багдановіча (вул. М.Багдановіча, 7а) з 26 жніўня да 27 верасня** працуе выстава «Беларусі з любоўю», дзе можна будзе пазнаёміцца з графічнымі творамі сучаснікаў Максіма Багдановіча. Асноўная частка прац — замалёўкі ў альбом, для сябе.

**Рэха дрэздэнскай акадэміі**

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1)** працуе выстава жывапісу «Рэха дрэздэнскай акадэміі». Аліна Першай і Ганна Лубкова падзеляцца з Вамі творчымі ўражаннямі аб вучобе ў Летняй дрэздэнскай акадэміі, своеасаблівых летніх курсах, якія штолета ладзіць гэтая аўтарытэтная навучальная ўстанова.

## ТЭАТРЫ

**27 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Я твая нявеста»

**28 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»

**29 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»

**30 жніўня**

**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

**3 верасня**

**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце лепш»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»

**4 верасня**

**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»

**5 верасня**

**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»

**Тэатр імя Горкага** — «Я веру ў гараскопы»

**6 верасня**

**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каралі, каралевы ды іншыя важныя персоны»

**Музычны тэатр** — «Кажан»



# Аб'ехаць за тры дні тры краіны на байдарцы!

**Хутка гэта стане магчымым дзякуючы праекту Еўрапейскай камісіі «Невядомая Еўропа».**

Аўгустоўскі канал злучае дзве краіны — Польшчу і Беларусь. Яго даўжыня больш за сто кіламетраў, з іх 22 кіламетры — на тэрыторыі Беларусі. Ужо больш за 30 гадоў у першыя выходныя красавіка на беларускай частцы Аўгустоўскага канала збіраюцца найлепшыя турысты-воднікі Беларусі. Тут яны адкрываюць сезон. І кожны год турысты гавораць, як цікава было б не толькі плаваць па беларускай частцы, але і праплыць да канца па Аўгустоўскім канале, а потым па Нёмане трапіць у Друскінінкай. За тры дні на байдарках. Каб убачыць тры краіны: Польшчу, Беларусь і Літву.

Спярша распрацавалі маршрут. І ў верасні 2008 года стартаваў праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Невядомая Еўропа — развіццё турысцкай інфраструктуры польска-беларускага памежжа ў раёне Аўгустоўскага канала і ракі Нёман».

Фінансаванне праекта ажыццяўлялася Еўрапейскай Камісіяй. Беларуская частка праекта каштуе каля 440 000 еўра.

Маршрут вельмі добра ўпісваецца ў сучасную сістэму адпачынку. Адна з арыгінальных ідэй «Невядомай Еўропы» — так званы актыўны ўік-энд: пятніца — польскі Аўгустоў, субота — беларускі Гродна, нядзеля — літоўскі Друскінінкай. У Беларусь турысты будуць вяртацца на цягніках альбо аўтобусах.

Адна з асноўных мэтаў праекта — стварэнне магчымасцяў займацца актыўным турызмам для людзей з недахопамі фізічнага развіцця. Гэта значыць, што паўсюль па ходзе маршруту будуць пабудаваныя пандусы. Нават для інвалідных калясак прадугледжаныя спецыяльныя байдаркі.

Дарэчы, маршруты распрацоўваюцца не толькі байдарачныя, але і веласіпедныя, і нават конныя.

### Свае інструктары

Ёсць прыгожы аб'ект — Аўгустоўскі канал, ёсць распрацаваныя маршруты. Але для таго, каб адкрываць новы турыстычны напрамак, гэтага недастаткова. У першую чаргу, патрэбныя інструктары, якія могуць забяспечыць бяспеку турыстаў, распавесці пра маршрут. Як і менеджэры, якія змогуць разумна арганізаваць тур. Дзе іх узяць?

— Практычна ніхто са студэнтаў, што скончылі інстытут фізкультуры альбо школу турызму ва ўніверсітэце, не прыйшоў у актыўны адпачынак, — бядуе Сяргей Каляда, нацыянальны каардынатар праекта. — А ўсё таму, што самі выкладчыкі глыбока перакананыя ў тым, што турызм — гэта гатэль і пляж. А спецыяліст па турызме сядзіць у фатэлі за кампутарам і чакае кліентаў, якія прынясуць грошы на Турцыю. Мы лічым, што трэба ствараць турызм тут. І самі рыхтуем інструктараў і менеджэраў, якіх турфірмы змогуць пазней наняць на працу.



Для таго, каб выбраць патэнцыйных інструктараў і трэнераў, арганізатары праекта «Невядомая Еўропа» прыйшлі са сваімі прэзентацыямі ва ўсе профільныя ВНУ, прапанавалі паўдзельнічаць у праекце самім студэнтам.

— Ахвотных было шмат, — распавядае С.Каляда. — Конкурс — пяць чалавек на месца. Мы стараліся разгледзець менавіта такіх, хто пазней прысвяціць жыццё актыўнаму турызму. Адразу ж адсеяліся неспартыўныя, што не ўмелі плаваць, ездзіць на роверы. У выніку жорсткага адбору набралі групу з 12 чалавек, якія ўжо ў гэтым годзе прайшлі стажыроўку ў Польшчы. Яшчэ 12 паедуць у наступным.

— Я так рада, што прайшла адбор. Стажыроўка ў Польшчы была проста шыкоўная, — распавядае студэнтка Надзя, удзельніца праекта. — Нас падзялілі на дзве каманды. На роварах мы пераязджалі з пункта ў пункт — пушча, стайні — там мы каталіся на конях, вучыліся іх сядлаць. Жылі спярша ў намёце, потым у шыкоўным гатэлі, у аграсядзібе. Потым перасякалі мяжу на байдарках ...

— Студэнты, якія прайшлі нашы стажыроўкі, ведаюць, што такое актыўны турызм. Яны вяртаюцца з Польшчы з ужо іншымі ўяўленнямі пра турызм, не турэцка-пляжны, — лічыць Сяргей Каляда.

Ужо ў верасні гэтага года першай групе прысвояць званне інструктараў.

У беларускіх аграсядзібах будзе ўсё, як у Еўропе.

Яшчэ адзін важны складнік для адкрыцця новага турыстычнага напрамку — месцы начлегу. Таму яшчэ адзін этап — гэта праца з гаспадарамі так званых аграсядзіб (сельскі турызм) і тымі, хто хоча імі стаць. Для знаёмства з еўрапейскім досведам яны таксама паехалі ў Польшчу.

— Магу сказаць, што ў палякаў ёсць чаму павучыцца, — распавядае гаспадар аграсядзібы Міхаіл, які толькі пачынае сваю справу. — Напрыклад, таму, як хутка і смачна яны гатуюць есці, як умеюць прываблівац да сябе турыстаў, якія разнастайныя забавы ствараюць для іх. Іх турысты катаюцца на лодках, на конях, на роварах! Былі мы і ва ўжо дзейных аграсядзібах на Гродзеншчыне. І магу сказаць, што ўзровень сервісу ў нас таксама вельмі высокі.

Іншыя гаспадары аграсядзіб распавядаюць, што вярнуліся з Польшчы проста ў захапленні і абавязкова будуць выкарыстоўваць убачанае ў сябе.

— Мы зробім пуцевадзіцелі, турыстычныя карты, прамаркіруем прыблізна 180 кіламетраў турыстычных маршрутаў, а потым будзем прапаноўваць гэтыя маршруты турфірмам, — распавядае Сяргей Каляда.

Праект плануецца скончыць у верасні 2010 года.

**ТЭЛЕПРАГРАМА НА 31 ЖНІЎНЯ—6 ВЕРАСНЯ**

## «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 31 жніўня, панядзелак

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 16 серыя
**19:50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**20:05** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:35** Госць «Белсата»
**20:50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Хрысціянства» (спазнаваўчая праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** «Угару, уніз», маст. фільм, рэж. Ян Гржэбэйк, 2004 г., Чэхія
**23:05** Аб'ектыў

### 1 верасня, аўторак

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 14 серыя
**19:30** «Першы дзень», дак. фільм, рэж. Марцін Саўтэр (Marcin Sauter), 2008 г., Польшча
**19:55** Побач з намі
**20:15** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**20:50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Рагвалод і Рагнеда» (спазнаваўчая праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 22 серыя
**22:10** Еўропа сёння (тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**22:40** Аб'ектыў

### 2 верасня, серада

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 15 серыя
**19:30** «Чатыры сімвалы», рэпартаж, 2008 г., Беларусь
**20:05** Хто ёсць кім: Уладзімір Арлоў
**20:20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Дзяржавы» (спазнаваўчая праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** «Бунт Л», маст. фільм, рэж. Кіран Каралаў, 2006 г., Балгарыя.
**23:00** Аб'ектыў

### 3 верасня, чацвер

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 16 серыя
**19:35** «Чырвоны беларус», рэпартаж, 2009 г.
**20:05** YoLife! (моладзевая праграма)
**20:20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Еўфрасіння Полацкая» (спазнаваўчая праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** «Рок назаўжды», дак. фільм, 2008 г., Беларусь, ч. 2
**21:55** Форум (ток-шоу): «Гендэр з намі! Адносіны палоў як сацыяльная праблема»
**22:40** Аб'ектыў

### 4 верасня, пятніца

**19:00** Аб'ектыў
**19:05** «Гастарбайтэр», рэпартаж, рэж. Сяргей Ісакаў, 2009 г., Беларусь
**19:35** МакраФон: Канцэрт Змітра Вайцюшкевіча
**20:05** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў, 9 серыя: «Расія, ч. 1»
**20:30** «Бульбаны», мультсерыял
**20:35** Госць «Белсата»
**20:50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Кірыла Тураўскі» (спазнаваўчая праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** «Чарада пачуццяў», меладраматычная камедыя, рэж. Радаслаў Піваварскі, 1993 г., Польшча
**22:40** Аб'ектыў

### 5 верасня, субота

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:10** МакраФон: З архіва «Jazz Jamboree», ч. 2: «Майлз Дэйвіс»
**19:50** «Бульбаны», мультсерыял
**20:00** Дакументальная гадзіна: «Іншае жыццё», дак. фільм, 2008 г.
**20:50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Крыжакі» (спазнаваўчая праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:10** Еўропа сёння (тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**21:40** «Дэтэрмінатар», серыял: 9 серыя
**22:25** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**22:50** Аб'ектыў




### 6 верасня, нядзеля

**19:00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19:15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 17 серыя
**20:00** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Урок беларускай мовы», дак. фільм, рэж. Міраслаў Дэмбінські, 2006 г., Польшча
**21:00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21:20** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21:45** Фільматэка майстроў: «Ад-магілы-да-магілы», маст. фільм, рэж. Ян Цвіткавіч, 2005 г., Славенія.



# Валянціна Быкава ўжо з новай плітой

Журналіст Глеб Лабадзенка выступіў з заклікам дапамагчы Валянціне Уладзіміраўне Быкавай — сястры Народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава — набыць новую газавую пліту замест старой, няспраўнай.

Неабходныя грошы хутка сабралі праз інтэрнэт.

Кіраўнік Ушацкай газавай службы Зміцер Талан бясплатна выдзеліў машыну, каб завезці пліту, майстры задарма падключылі апарат гаспадыні.

**labadzenka.by;**
**Валянціна Быкава на фота справа**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Шчыра віншуем** Дзяніса і Таццяну Садоўскіх з нараджэннем сына Марціна. Шчасця малому і бацькам! Сябры

### ШКОЛЬНЫ КАСЦЮМ

**Прадам** самавіты школьны касцюм. Цёмны графіт з вішнёвай ніткай: рост 140 см, у пасе 68—71 см. Пінжак 2 разы надзеты, штаны няношаныя — перараслі. 19 даляраў. Як хто шматдзетны — можна трохі танней. Т.: (029) 877-30-00

### ПАДЗЯКА

**Гомельскія сябры выказваюць шчырую падзяку Насці Лойцы** за падтрымку і дапамогу. Настачка, дзякуй табе вялікі і нізкі паклон. Ты нам як анёл-абаронца, без перабольшання.

### ПІКНІК

**Парафіяльная Рада Царквы Жыровіцкае Іконы Божае Маці**, што ў Нью-Джэрсі, запрашае на пікнік, які адбудзецца ў нядзелю 30-га жніўня ў парафіі Царквы. Пікнік пачнецца а палове на адзінаццатую (10.30 а.м.). Адрас: 9 River Road, Higlland Park, NJ 08904.

### КНІГІ

**Прадаю** Біблію. Кошт 5000 рублёў. Жадаючым дашлю па пошце. Т.: (0212) 25-80-79

**Прадам** «Беларускую энцыклапедыю» ў 18 т. (камплектам ці па тамах). Т.: (017) 298-16-62.

## АНЕКДОТЫ

Добрая навіна: дно крызісу прайшлі. Дрэнная навіна: далей прыйдзецца закопвацца ў пясок.

* * *

Калі вы лысы, а побач два барадатыя немцы, магчыма, вы — Ленін.

* * *

Ёсць розныя віды хлусні. Проста хлусня, беспардонная хлусня і афіцыйныя дадзеныя статыстыкі.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Як тэлеграфам можна перасылаць па дроце ліст, так сама тэлефонам можна перасылаць па дроце мову. Тэлефоны для краю дужа карысная рэч, і за граніцай яны ўсюды заведзены. Трэба, скажам, пільна доктара, ксяндза, папа — пагаварыў праз тэлефон — за хвіліну-дзве ксёндз ужо збіраецца ехаць. Трэба, скажам, прадаць на вёсцы жыта, а не ведаем цаны, зараз праз тэлефон запытаўся ў Вільні, якая цана на жыта — і ўжо не ашукаюць.

**«Наша Ніва». №32. 1909**




## Будзе каляндар з аголенымі баскетбалісткамі

**Найбольш паспяховая і любімая гульнявая каманда краіны — жаночая баскетбольная зборная — вырашыла парадаваць сваіх прыхільнікаў выпускам календара. Першай зрабіла фотасесію Наталля Марчанка.**




**23 жніўня эколагі і анархісты зладзілі ў Астравецкім раёне шэраг акцый пратэсту супраць пабудовы атамнай электрастанцыі. На фота: пятнаццаціметровы транспарант з'явіўся ля вёскі Міхалішкі, на мосце праз Вілію, ваду з якой плануюць браць для ахаладжвання беларускай АЭС.**



## Мядзведзева абралі богам

Бурацкія ламы прапанавалі расійскаму прэзідэнту стаць божышчам свайго пантэону.

Белая Тара — пашаноўнае будысцкае божышча. У яго сем вачэй, трэцяе вока — у ілбе і па дадатковаму воку на далонях і ў ступаках. Ламы планавалі пасадзіць расійскага кіраўніка, які знаходзіцца з візітам у Бурацыі, на трон «Белага Цара», што з'яўляецца знакам Белай Тары на зямлі. Цырымонія ўсталявалася ў часы кіравання Кацярыны II. З яе часоў усе хамба-ламы давалі адмысловую прысягу «Беламу цару», а падчас асабістай сустрэчы ляжалі пластом перад ім.

Ламы збіраліся аднавіць традыцыю, якая абарвалася ў савецкі час. Мядзведзеў лісліваю прапанову бурацкіх ламаў адхіліў. Але на сустрэчы ў Івалгінскім манастыры выглядаў цалкам шчаслівым.

**Андрэй Расінскі**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, аднаўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

©**НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам A2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6075. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 25.08.2009.
Замова № 4636.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.

ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12